КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №5 (181)
◂ 12 ЛЮТАГА ◂ 2010 г.

# Новы Час




**НЯМА КАГО БАЙКАТАВАЦЬ**
Стар. 14

**ФЛЕГМАТЫЧНЫ ВЫБАР**
Перад ад'ездам на выбары ва Украіну ў думках раз-пораз паўставалі вобразы палітычнай драмы мінулай кампаніі
Стар. 5

**МЕСЯЧНЫЯ АМБІЦЫІ**
Наступным чалавекам, які прагуляецца па Месяцы, будзе індус або кітаец. Так сцвярджаюць эксперты
Стар. 12

**ДРЭЗДЭН: ПАЎСТАННЕ З ПОПЕЛУ**
Стар. 15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**АЛЯКСЕЙ МАРАЧКІН**

Нарыс Аляксандра Тамковіча з цыклу «Трэці сектар у асобах»

▸ З НАГОДЫ

# ПЫЛ У ВОЧЫ. ДЛЯ КАГО?

Вольга ХВОІН

**У 2008 годзе Польшча была адным з ініцыятараў пачатку дыялога, паміж Еўрапейскім саюзам і Беларуссю. Праз паўтара года заходняя суседка атрымала своеасаблівы адказ у выглядзе чарговага канфлікту з непрызнаным уладамі Саюзам палякаў у Беларусі.**




Восенню 2008 года міністр знешнепалітычнага ведамства Польшчы Радаслаў Сікорскі заяўляў, што ЕС мусіць паскорыць рашэнне пра дыялог, бо сітуацыя ў Беларусі змянілася і «палітвязняў больш няма». Еўропа насамрэч наважылася наводзіць масты з рэжымам Лукашэнкі. І нават дасягнула пэўнага поспеху ў гэтай справе. Прынамсі дыпламаты краін ЕС загаварылі больш пра магчымасці, чым перашкоды. Асцярожная крытыка на пэўныя недэмакратычныя дзеянні афіцыйнага Мінска гучала толькі з вуснаў прадстаўнікоў дыпмісій Скандынавіі, Славакіі ды заезджых чыноўнікаў са структур ЕС. Увесь гэты час супрацоўнікі пасольства Польшчы ў Беларусі пазбягалі рэзкіх выказванняў на адрас беларускіх уладаў.

Полымя разгарэлася з іскры ў Івянцы: мясцовы Дом польскі не змаглі падзяліць два саюза палякаў у Беларусі — афіцыйны і незарэгістраваны. Судовыя выканаўцы зрабілі вопіс маёмасці Дома польскага, сілай выставіўшы з будынка актывістаў неафіцыйнага саюза. Гэтаму канфлікту папярэднічаў ціск на мясцовую кіраўніцу польскай суполкі і Дома польскага Тэрэзу Собаль. Тады канфлікт паміж Польшчай і Беларуссю абмежаваўся размовай з польскімі дыпламатамі ў МЗС. Высяленне з будынка непрызнанага ўладамі Саюза палякаў справакавала хвалю абурэння ў вышэйшых палітычных колах Польшчы. З-за канфлікту ў Івянцы пасол Польшчы ў Беларусі Хенрык Літвін быў адкліканы для кансультацый у Варшаву. Прэзідэнт Польшчы Лех Качыньскі запрасіў на сустрэчу лідэра неафіцыйнага Саюза палякаў Анжаліку Борыс.

Польская апазіцыйная партыя «Права і справядлівасць», якую ўзначальвае Яраслаў Качыньскі, брат прэзідэнта Польшчы Леха Качыньскага, запатрабавала адмяніць візіт у Варшаву міністра замежных спраў Беларусі Сяргея Мартынава, што запланаваны на 12 лютага, у сувязі з сітуацыяй вакол Дома польскага ў Івянцы.

У інтэрв'ю польскай газеце «Rzeczpospolita» міністр Мартынаў паведаміў, што падчас гэтай сустрэчы будзе падпісана дамова аб малым памежным руху. І што Беларусь не супрацьадмяніць візы для палякаў, але толькі на прынцыпах узаемнасці. У цяперашніх умовах гэта, натуральна, справа далёкай перспектывы, бо Польшча ўваходзіць у шэнгенскую зону, і пытанне візавых стасункаў вырашаецца не толькі ў Варшаве.

Што да канфлікту вакол двух саюзаў палякаў, то Мартынаў заявіў, што кіраўнікі абедзвюх арганізацый павінны паразумецца, а не шукаць падтрымкі ў іншых.

Тым часам кіраўнік партыйнай фракцыі ў сейме Гражына Генсіцка заклікала прэм'ер-міністра Дональда Туска звярнуцца ў ЕС з прапановай накласці на Беларусь гандлёвае эмбарга. Кіраўнік МЗС Польшчы Радаслаў Сікорскі ў сваіх заявах больш асцярожны і па-ранейшаму лічыць, што «з Беларуссю трэба размаўляць, а не ізаляваць яе». Паводле яго меркавання, пытанне наконт польскай меншасці ў Беларусі варта перадаць у міжнародныя інстытуты. Таксама міністр знешнепалітычнага ведамства нагадаў, што паважаць правы нацменшасцяў і апазіцыі — «асноўная ўмова збліжэння з Еўрасаюзам».

Нягледзячы на рэакцыю польскіх палітыкаў, Еўрасаюз наўрад ці пойдзе на зваротванне дыялогу з Беларуссю. Занадта многа сіл было прыкладзена, каб вывесці Беларусь на шлях перамоў. Еўропа не хоча бачыць дыктатуру пад сваім бокам, але яшчэ больш яна не хоча бачыць гэту дыктатуру пад патранажам Расіі. Калі скандал не вырашыцца на міждзяржаўным узроўні, магчыма, будзе заяўлена нота пратэсту ці пытанне па нацменшасцях закране Еўракамісія. Дарэчы, ЕС пакуль што цярпліва прымае і разгоны вулічных акцый у Мінску, і ціск на журналістаў, і новы ўказ аб рэгуляванні інтэрнэту. Чакаць радыкальных крокаў у бок замарожвання адносінаў не варта як мінімум да прэзідэнцкіх выбараў — менавіта іх вынік і ўмовы правядзення могуць стаць кропкай, ад якой будзе весціся новы вектар знешняй палітыкі.

Зрэшты, не падобна, каб і Беларусь падагравала канфлікты з мэтай паставіць жалезную заслону на заходняй мяжы. Больш выглядае на чарговае падкручванне гаек, якія пры нагодзе можна паслабіць, тым самым прадэманстраваўшы сваю «згаворлівасць» ды жаданне «дэмакратызавацца». А вярнуць палякам будынак ці проста пакінуць на час іх у спакоі усё ж для ўладаў значна больш бяспечна, чым даць адносную свабоду парачцы газет ці акрэдытаваць «Белсат», не гаворачы ўжо пра легалізацыю нязручных палітычнаму рэжыму партый ды грамадскіх арганізацый. Дарэчы, згода пачаць дыскусію вакол адмены смяротнага пакарання (хай сабе і базавай агульнагуманістычнай каштоўнасці) для ўладаў таксама не балючая і фактычна нічога не вартая. Усё гэта фактары, якія ніякім чынам не ствараюць пагрозы выбудаванай палітычнай сістэме. Таму цалкам слушным можа быць меркаванне, што канфлікт — гэта толькі пыл у вочы ЕС, якім зручна адцягнуць увагу ад больш значных падзей і праблем, што маюць месца ў Беларусі.

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### МАСТЫ. ЖЫРОЎКІ ПАЦЯЖЭЮЦЬ

Шэраг жыллёва-будаўнічых каапаратываў атрымалі паведамленні ЖКГ, што ў бягучым годзе будуць плаціць за камунальныя паслугі па фактычнаму сабекошту.

Гэта рашэнне ЖКГ абгрунтоўвае тым, што з бюджэту не выдзелена адпаведных датацый насельніцтву, якое пражывае ў жыллёвым фондзе, што не абслугоўваецца ЖКГ. У мінулым годзе жыхары шэрагу ЖБК плацілі поўны кошт за вываз «смецця» — 1700 рублёў з чалавека, што болей чым у 3,5 разы перавышала плату з жыхароў, якія абслугоўваюцца ЖКГ (470 рублёў). У разе поўнай аплаты камунальных паслуг сумы ў «жыроўках» грамадзян у кааператывах, якія не абслугоўваюцца ЖКГ, могуць вырасці ў два разы, нягледзячы на заявы ўраду пра тое, што насельніцтва плаціць толькі каля 37% сабекошту камунальных паслуг.

Выйсцем, паводле ЖКГ, з'яўляецца перадача каапаратываў на поўнае тэхнічнае абслугоўванне Мастоўскаму РУП ЖКГ. Аднак дэпутат райсавета Дзмітрый Кухлей бачыць сітуацыю інакш: «Кіраўніцтву каапаратываў варта штомесячна звяртацца ў фінаддзел Мастоўскага райвыканкаму з адпаведнымі разлікамі неабходнай сумы датацый, якую выканкам павінен кампенсаваць грамадзянам з бюджэту».

### АСТРАВЕЦ. КОШТ АЭС УЗРАСТАЕ ШТОДНЯ

За 60 гадоў, на якія разлічаны тэрмін эксплуатацыі атамнай станцыі, перапрацоўка адпрацаванага ядзернага паліва запатрабуе вялікіх выдаткаў. Пра тое, што Расія зможа забіраць гэтыя рэшкі атамнай вытворчасці, распавядаў нядаўна намеснік міністра энергетыкі Міхаіл Міхадзюк. Аднак расійскі фізік-ядзершчык Андрэй Ажароўскі пацвердзіў паведамленне «Еўрарадыё», што расійскае заканадаўства забараняе захоўваць на сваёй тэрыторыі парэшткі АЭС з іншых краін. Яшчэ на грамадскіх слуханнях наконт пабудовы ў Астраўцы АЭС прадстаўнік Расатаму заявіў, што Расія не будзе займацца беларускімі адкідамі. Але ж зараз прэс-служба кампаніі пацвердзіла словы беларускага чыноўніка, што ядзернае паліва, выраблёнае ў Расіі і скарыстанае за мяжой, можа вяртацца назад, і гэтаму заканадаўства не пярэчыць. Аднак адной ініцыятывы карпарацыі не дастаткова. Для ўвозу адпрацаванага паліва неабходна станоўчае заключэнне Дзяржаўнай экалагічнай камісіі Расіі нават па кожнаму вагону падобных паставак. А яшчэ гэта выключна рынычная паслуга. І нятанная — кошт аднаго кілаграма такога прадукту вагаецца ад 680 да 1500 долараў. За час эксплуатацыі АЭС Беларусь мусіць сплаціць Расіі за перапрацоўку паліва ад 108 да 240 мільёнаў долараў.

### МЁРЫ. ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ БАЛОТА

Грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ) завяршае прыродаахоўны праект на буйнейшым беларускім балоце «Ельня». На працягу двух гадоў працы па аднаўленню гідралагічнага рэжыму цэнтральнай часткі балота, акрамя спецыялістаў, працавалі больш за сотню валанцёраў АПБ з усіх куткоў Беларусі. За гэты час на асушальных калісьці каналах пабудавана больш за 30 плацін са ствалоў гарэлых дрэў і торфу. Ельня — адно з буйнейшых верхавых балот у Еўропе. Размешчана ў Мёрскім і Шаркоўшчынскім раёнах і займае плошчу болей за 200 квадратных кіламетраў. Меліярацыя, што адбылася тут у мінулым стагоддзі, прывяла да зніжэння ўзроўню грунтовых водаў і частых пажараў. У выніку апошняга пажару 2002 года выгарала 70 працэнтаў тэрыторыі балота. Эканамічныя страты ад знішчэння пажарам толькі журавініку складаюць 100 мільёнаў рублёў штогод. Балота абвешчана ландшафтным заказнікам рэспубліканскага значэння, а таксама тэрыторыяй міжнароднага значэння, важнай для птушкі. Тут пражывае 98 відаў птушак, 23 з якіх занесены ў чырвоную кнігу, і расце 11 відаў рэдкіх раслін, у тым ліку карлікавая бяроза і марошка. Гэта таксама месца прыпынку пералётных птушак.

### МЯДЗЕЛ. ІНІЦЫЯТЫВА АДНАЎЛЕННЯ

У сацыяльнай сетцы vkontakte з'явілася суполка, прысвечаная Мядзельскай Кальварыі. Адміністратар суполкі Руслан Шошын заклікае неабыякавых інтэрнэт-карыстальнікаў спрычыніцца да распаўсюду інфармацыі і прац па аднаўленні Кальварыі, закладзенай у XVIII стагоддзі. Акрамя таго, выказваецца ідэя наконт правядзення тут каталіцкіх летнікаў і заснавання турыстычнага маршрута, які павінен ахопліваць шэраг гістарычных аб'ектаў.

### ЛІДА. КРАЯЗНАЎЧАЯ ШКОЛА

Гарадская арганізацыя ТБМ супольна з мясцовым гістарычна-літаратурным музеем стварыла краязнаўчую школу. На паседжанні, куды можа патрапіць кожны аматар даўніны, запрашаюцца знакамітыя пісьменнікі, паэты, навукоўцы, краязнаўцы. Адбываюцца пасяджэнні два разы на месяц. На адкрыцці школы прысутнічаў Уладзімір Арлоў. На чарговае пасяджэнне запрошаны гродзенскі гісторык, прафесар Алесь Краўцэвіч.

### НАВАПОЛАЦК. У ГОНАР КЛАСІКАЎ

Суполка «Рубон» гарадской арганізацыі Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны і бібліятэка імя Я. Коласа ў Наваполацку зладзілі акустычны канцэрт «Купала / Караткевіч». На словы класікаў беларускай літаратуры Я. Купалы і У. Караткевіча выканалі спевы вядомыя маладыя барды Раман Яраш і Андрэй Касцень. Сустрэча адбылася ў межах ініцыятывы «Будзьма беларусамі».

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

## БУНІН ПА-БЕЛАРУСКУ

Аляксей ХАДЫКА




**Прэзентуючы 10 лютага ў кнігарні Галерэі «Ў» зборнік выбраных твораў Івана Буніна на беларускую мову, прафесар Вячаслаў Рагойша трапна вызначыў сакральную сутнасць працы перакладчыка: «Пераклад адыгрывае літаратуратворчую, моватворчую, нацыятворчую ролю…»**

І калі перакладаць на беларускую з рускай, складанасць задачы знайсці адпаведную рытміку, інтанацыю ў мове перакладу павышаецца.

У фаліянт з 846 старонак, надрукаваны выдавецтвам І. П. Логвінава, увайшлі лепшыя апавяданні са знакамітага зборніка «Цёмныя алеі», аповесці «Вёска», «Сухадол», раман «Жыццё Арсеннева».

Перакладчык — вядомы спецыяліст па сцэнічнай мове, тэатральны педагог і актор, прафесар Андрэй Каляда, да літаратурнага перакладу прыйшоў болей 20 гадоў таму. Тады ён адчуў востры недахоп твораў сусветнай класікі для працы з уласнымі навучэнцамі ў тагачасным Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце, прарэктарам якога стаў напачатку часоў беларусізацыі. За апошнія гады двойчы выходзілі зборнікі пераўвасобленых ім твораў Дастаеўскага, кніга тэатральных п'ес «Лялечны дом», перакладаліся тэксты Астроўскага, Чэхава, Гогаля, маладых беларускіх аўтараў, што пішуць па-руску.

Яшчэ больш выйшла аўдыёкніг, запісаных унікальным голасам Андрэя Андрэевіча, у якім прысутны на вечарыне гісторык кнігі Мікола Нікалаеў з Пецярбургу, па нараджэнні зямляк Каляды з Наваградчыны, адчуў «аўтэнтычныя інтанацыі мовы Статуту ВКЛ». Пераджыць думку, інтанацыю, рух душы аўтара — і вымавіць па-беларуску — творчы метад Каляды, заснаваны на акторскай практыцы.

У яго планах — падступіцца да іншых нобелеўскіх вяршынь рускай літаратуры — Барыса Пастэрнака, Аляксандра Салжаніцына, Міхаіла Шолахава. Беларусь і Расія справядліва ганарацца роднаснасцю сваіх культур, але агульная культурная прастора духоўна існуе толькі тады, калі ўзнікае яе матэрыяльная падстава, узаемны пераклад шэдэўраў нацыянальнага пісьменства.

КАМПАНІЯ

## ЗА СВАБОДНЫ ІНТЭРНЭТ

**Моладзевы рух «Маладая Беларусь» абвяшчае аб правядзенні кампаніі «За вольны інтэрнэт», у рамках якой пачынае збор подпісаў за адмену ўжо прынятага, але не ўступіўшага ў законную сілу Указу прэзідэнта № 60.**

Падчас кампаніі плануецца сабраць больш за 50 тысяч подпісаў і перадаць старшыні Канстытуцыйнага суда, старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, а таксама беларускаму кіраўніку з мэтай звярнуць увагу на актуальнасць праблемы і з патрабаваннямі адмены Указу Прэзідэнта РБ № 60, забеспячэння выканання законных правоў і інтарэсаў насельніцтва, замацаваных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і Усеагульнай дэкларацыяй правоў чалавека.

Нагадаем, што 1 ліпеня 2010 года ўступае ў законную сілу Указ прэзідэнта РБ «Пра меры па ўдасканаленні выкарыстання нацыянальнага сегмента сеткі інтэрнэт».

З 1 ліпеня наведваць інтэрнэт-клубы можна будзе толькі з пашпартам, а чытаць толькі цэнзураваную інфармацыю. Дадзенае палажэнне наўпрост супярэчыць канстытуцыйным прынцыпам Рэспублікі Беларусь і Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека ў галіне свабоднага атрымання і распаўсюду інфармацыі, таямніцы асабістай карэспандэнцыі і ўмяшання дзяржавы ў асабістае жыццё грамадзяніна.

**Паводле прэс-службы «МБ»**

РЭФЕРЭНДУМ

## СУПРАЦЬ ПАДВЫШЭННЯ МЫТНЫХ ПОШЛІНАЎ

**Сойм Партыі БНФ прыняў рашэнне ініцыяваць рэспубліканскі рэферэндум па пытанні падвышэння мытных пошлінаў на аўтамабілі.**

Аргкамітэт прапануе вынесці на рэспубліканскі рэферэндум наступнае пытанне: «Ці падтрымліваеце Вы захаванне памеру мытных пошлін на ўвоз у Рэспубліку Беларусь легкавых аўтамабіляў замежнай вытворчасці на ўзроўні 26 лістапада 2009 года?»

Зараз неабходна сфармаваць спіс ініцыятыўнай групы. Менавіта праз збор дадзеных асобаў, якія згодныя падтрымаць ініцыятыву Партыі БНФ аб рэферэндуме, будзе сфармаваная база дадзеных для наступнага правядзення сходу ініцыятыўнай групы і фармавання канчатковага спісу яе ўдзельнікаў.

Каб запісацца ў ініцыятыўную групу, трэба асабіста звярнуцца на Сядзібу Партыі БНФ па адрасе г. Мінск, пр. Машэрава, 8 або звязацца па тэлефоне (+375 17) 284 50 12.

У рэгіёнах працу па стварэнні ініцыятыўнай групы каардынуюць:

Брэсцкая вобласць — Зміцер Шыманскі (+375 29 6605741)

Віцебская вобласць — Кастусь Смолікаў (+375 29 1189238)

Гродзенская вобласць — Вадзім Саранчукоў (+375 29 6540534)

Гомельская вобласць — Валер Пуцікі (+375 29 3517978)

Магілёўская вобласць — Зміцер Салаўёў (+375 29 6915963)

**Паводле прэс-службы Партыі БНФ**

ЦІСК

## КДБ ПАПЯРЭДЗІЛА

**Актывісты дэмсіл Магілёва накіравалі на імя генеральнага пракурора, старшыні КДБ і міністра архітэктуры і будаўніцтва ліст у абарону правоў электраманцёра СУ–129 (філіяла «Лаўсанбуда») Мікалая Расюка.**

Актывісты выказалі сваю занепакоенасць і абурэнне дзеяннямі адміністрацыі ААТ «Лаўсанбуд», якое адмовілася працягнуць кантракт з Мікалаем Расюком, а таксама дзеяннямі Упраўлення КДБ па Магілёўскай вобласці, якое аб'явіла яму афіцыйнае папярэджанне «Аб недапушчальнасці супрацьпраўных дзеянняў» за быццам бы неадназразовыя спробы арганізацыі несанкцыянаваных сходаў і мітынгаў будаўнікоў 27–28 лістапада 2008 года і дэманстрацыі 30 красавіка 2009 года.

«За 7 гадоў працы, — гаворыцца ў лісце, — Расюк не меў ніводнай заўвагі, толькі ўхвалы, у тым ліку ад Магілёўскага аблвыканкама. Не адпавядаюць рэчаіснасці і факты, якія сталіся падставай для пастаноўкі на ўлік КДБ».

Прычыны пераследу рабочага М. Расюка магілёўскія дэмакраты бачаць у яго актыўнай грамадзянскай пазіцыі. Ён — актывіст Свабоднага прафсаюза, збірае ўдзельнічаць у мясцовых выбарах, уваходзіць у склад грамадскага аб'яднання «Камітэт грамадзянскага кантролю», выступае супраць парушэння працоўнага заканадаўства і тэхнікі бяспекі.

Магілёўскія дэмакраты патрабуюць «правесці праверку і прад'явіць дакументальныя пацвярджэнні фактаў здзяйснення Расюком М. П. дзеянняў супрацьпраўнага характару», а таксама адмяніць папярэджанне і аднавіць рабочага на працы.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# СТРАТЫ ПЕРАД СВЯТАМ

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Вось і надышоў «масленічны тыдзень». Ёсць нагода пацешыць сябе блінамі, а 14 лютага, у нядзелю, «праводзіць зіму», якая, здаецца, пакуль нікуды сыходзіць не збіраецца. Але калі ў надвор'і істотных зменаў не назіраецца, то палітычны «градус» у краіне ўзрастае, як на дрожжах. У адсутнасць у краіне прэзідэнта, улады знoўку «напаролі касякоў», ствараючы канфлікты там, дзе іх быць не павінна.**




Photo.ByMedia.Net

Набліжаецца да старту паўнавартасная кампанія па мясцовых выбарах. На тыдні стала вядома, што ў склад акруговых выбарчых камісій уключаны 72 прадстаўнікі апазіцыйных палітычных партый. Гэта 48 чалавек ад Беларускай партыі левых «Справядлівы свет», 14 — Аб'яднанай грамадзянскай партыі, 6 — Партыі БНФ, 3 — Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады, 1 — Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада).

Гэта параўнальна высокі вынік адносна ўключэння апазіцыянераў у тэрытарыяльныя камісіі. Але калі ўлічыць, што ўсяго ў склад 367 акруговых камісій уключаны 4 542 чалавекі, то гэта толькі паўтара працэнты. Для параўнання, у склад акруговых выбарчых камісій увайшлі 319 прадстаўнікоў грамадскага аб'яднання «Белая Русь», 332 — Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, 218 — Беларускага саюза жанчын, 225 — Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў, 701 — Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

Гэта зноў дазволіла дэмакратычнай грамадскасці казаць пра тое, што мясцовыя выбары пройдуць па старым сцэнары, і дэпутаты будуць прызначацца, а не абірацца. Хаця, здавалася б, чаму не дапусціць апазіцыянераў да мясцовых саветаў, якія не маюць канкрэтных паўнамоцтваў і нічога не вырашаюць. Дык не, нават добры твар перад Еўропай улады зрабіць не жадаюць.

Таксама можна ўявіць, як зараз крые матам нядбайных беларускіх чыноўнікаў міністр замежных спраў Беларусі Сяргей Мартынаў. Толькі збіраўся ён з'ездзіць у Польшчу 12 лютага, абмеркаваць там з калегамі свае пытанні, закупіцца да Дня святога Валянціна падарункамі сваім любімым жанчынам, і тут — на табе! 8 лютага ў Дом польскі прыбылі судовыя выканаўцы ў суправаджэнні супрацоўнікаў міліцыі — усяго прыкладна 20 чалавек. Яны паказалі пастанову, згодна з якой кіраўніцтва Дома польскага незаконна завалодала чужой маёмасцю, і запатрабавалі ад усіх, хто знаходзіўся ў будынку, вызваліць яго для правядзення вопісу маёмасці.

Як вынік — пасол Польшчы ў Беларусі Генрык Літвін адкліканы ў Варшаву. Пасол Беларусі ў Польшчы Віктар Гайсёнак быў выкліканы ў польскае МЗС — польскі бок выказаў яму сур'ёзную занепакоенасць дзеяннямі беларускіх праваахоўных органаў у дачыненні да Дома польскага. Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Польшчы Радаслаў Сікорскі заявіў, што мае намер «па-мужчынску» пагутарыць са сваім беларускім калегам Сяргеем Мартынавым падчас візіту апошняга ў Варшаву.

Польская апазіцыйная партыя «Права і справядлівасць» (ПіС), якую ўзначальвае Яраслаў Качыньскі, брат-блізнюк прэзідэнта Польшчы Леха Качыньскага, звярнулася да міністра замежных спраў Радаслава Сікорскага з патрабаваннем адмяніць візіт Сяргея Мартынава. Акрамя гэтага, ПіС заклікае прэм'ер-міністра Дональда Туска звярнуцца ў ЕЗ з прапановай пра накладанне на Беларусь гандлёвага эмбарга. Прэзідэнт Польшчы асабіста выступіў з заявай, у якой цалкам падтрымаў Саюз палякаў Беларусі, якім кіруе Анжаліка Борыс, адзначыўшы, што беларускія палякі «ўвесь час церпяць неабгрунтаваныя рэпрэсіі».

Такім чынам, замест прыемнага піцця гарбаты ў Мартынава будзе жорсткая «мужчынская» размова. Спадзяемся, да бойкі не дойдзе, але шопінг Мартынаву будзе сапсаваны дакладна.

Непрадуманая антыалкагольная палітыка нанесла страты беларускім піваварам, якія на тыдні лічылі свае страты. У выніку забароны на продаж піва ў кіёсках на прыпынках грамадскага транспарту беларуская піўная прамысловасць страціла да 30 працэнтаў агульнай рэалізацыі прадукту. Такую лічбу назваў генеральны менеджэр кампаніі Heineken у Беларусі Аляксей Чарняеў.

Паводле яго слоў, для збыту піва існуе некалькі каналаў. «Канал рэстаранаў і бараў у Беларусі зусім не развіты. Канал дробнарознічнага гандлю ў кіёсках быў развіты, але пасля забароны продажу там піва беларуская піўная прамысловасць страціла да 30 працэнтаў агульнай рэалізацыі прадукту. Тым больш, што ў кіёсках у асноўным прадавалі айчыннае піва — імпарту там было няшмат», — адзначыў Чарняеў.

Якім чынам піўная галіна можа кампенсаваць гэтыя страты ў найбліжэйшы час, акрамя адмены забароны на гандаль півам у шапіках, Чарняеў пакуль не ўяўляе. «Нам прапануюць весці дробнарознічны гандаль у спецыяльна адведзеных для гэтага месцах: устанаўліваць столікі, палаткі, «грыбочкі» і гэтак далей. Але ўстаноўка такіх аб'ектаў патрабуе або ліцэнзавання, або ўзгаднення ў Мінгарвыканкаме, а як гэта зрабіць — невядома, паколькі такі механізм не прапісаны», — паведаміў Чарняеў.

Ён таксама сумняваецца, што ўзмацненне адказнасці за распіццё піва ў грамадскіх месцах дасць станоўчы вынік. «Усе піваварызгаджаюцца з тым, што найбольшае падзенне рэалізацыі піва адбываецца тады, калі ўводзяцца нейкія забароны, як гэта было з забаронай на продаж піва ў кіёсках», — адзначыў Чарняеў.

Тым часам нашы дэпутаты па-ранейшаму заклапочаны «завінчваннем гаек». У Палаце прадстаўнікоў створана рабочая група па падрыхтоўцы змяненняў у закон «Аб дзяржаўным рэгуляванні вытворчасці і абароту алкагольнай, нехарчовай прадукцыі, нехарчовага этылавага спірту» і прадукцыі з утрыманнем спірту.

Як паведаміў старшыня камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі ніжняй палаты парламента Алег Вялічка, законапраект прадугледжвае павелічэнне ўзроставай планкі для асобаў, якім забаронена набываць алкагольныя напоі, з 18 да 21 года. У працоўную групу ўваходзіць 21 асоба — прадстаўнікі парламента, зацікаўленых міністэрстваў і ведамстваў. Плануецца, што законапраект будзе распрацаваны і афіцыйна ўнесены ў Палату прадстаўнікоў у маі гэтага года.

Добра ўладкаваліся нашы дэпутаты! 21 чалавек будзе атрымліваць заробак да мая за тое, што зменіць у дзейсным законе лічбу «18» на лічбу «21»! Проста каб зрабіць звычайную глабальную замену ў дакуменце, што любы карыстальнік камп'ютэра зробіць за хвіліну, дэпутаты будуць атрымліваць заробак тры месяцы. Мне б такую працу.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### АЛЕГ АНТОНЕНКА



Сцяганосцам зборнай Беларусі на зімовых Алімпійскіх гульнях у канадскім горадзе Ванкувер будзе форвард нашай хакейнай каманды Алег Антоненка. Антоненка ўдзельнічаў у першай для хакейнай зборнай Беларусі Алімпіядзе ў 1998 годзе.

Пачатак цяперашняга сезона Алег Антоненка правёў у складзе дэбютанта Кантынентальнай хакейнай лігі «Аўтамабіліста» (Екацярынбург). Пасля траўмы ў кастрычніку мінулага года хакеіст прыехаў на лячэнне ў Мінск, дзе і атрымаў прапанову далучыцца да мінскага «Дынама». Алег Антоненка, якога празвалі «снайперам на даху», у складзе зборнай Беларусі правёў 143 матчы, удзельнічаў у 11 чэмпіянатах свету і доўгі час быў капітанам нацыянальнай зборнай. У 2007 годзе спартовец быў прызнаны лепшым хакеістам Беларусі. У тым сезоне ён стаў чэмпіёнам Беларусі ў складзе мінскага «Дынама», а таксама лепшым бамбардзірам беларускай экстралігі і нацыянальнай зборнай на першынстве планеты ў Маскве і Мыцішчах.

Алег Антоненка — выхаванец мінскага «Юнацтва», пачынаў кар'еру яшчэ ў чэмпіянаце СССР у складзе мінскага «Дынама». Выступаў за хакейныя клубы Беларусі, Расіі, Чэхіі. У мінулым сезоне Алег выступаў за МУС з Балашыхі і стаў лепшым снайперам клуба ў яго гісторыі. На знак удзячнасці 38-гадоваму хакеісту міліцыянты-ветэраны, якія апякуюцца падмаскоўным ХК МУС, падаравалі пісталет, што страляе шумавымі патронамі.

### ІВАН ШУЛЬГА



У 2006 годзе, пасля прэзідэнцкіх выбараў, на «сутках» пераседзелі многія беларускія журналісты з недзяржаўных СМІ. Працаўнікам медыясферы выпадак з аператарам неакрэдытаванага ў Беларусі тэлеканала «Белсат» мусіць нагадаць, што для іх дарога да закратаванай камеры не вельмі далёкая. Журналіста Івана Шульгу затрымалі падчас аблогі падпольнага офіса тэлеканала ў Мінску. Івана абвінавацілі ў дробным хуліганстве, і суддзя Аксана Рэлява асудзіла яго да 10 сутак арышту. Сведак журналісцкага «хуліганства» апроч міліцыянтаў не было, а палова судовага пасяджэння прайшла ў закрытым рэжыме.

Беларуская асацыяцыя журналістаў арганізавала акцыю салідарнасці з Іванам Шульгой: у ізалятар часовага ўтрымання на Акрэсціна ў Мінску калегі дасылалі лісты са словамі падтрымкі супрацоўніку тэлеканала. І, відаць, не адзін журналіст, падпісваючы ліст Івану, падумаў, што можа апынуцца на яго месцы ў любы момант. Тым больш, што да вялікай палітычнай кампаніі 2011 года засталося не так многа часу.

### СЯМ'Я ЛАПІЦКІХ



У Жодзіне бацькі школьніка Янкі Лапіцкага судзяцца з мясцовымі ўладамі за права свайго сына вучыцца на беларускай мове. «Мы абскарджваем рашэнне Жодзінскага гарвыканкама, паводле якога наш сын мусіць атрымліваць рускамоўную адукацыю, бо нібыта Жодзінскі гарадскі аддзел адукацыі не можа забяспечыць індывідуальнае навучанне па-беларуску», — расказаў «Радыё Свабода» Аляксей Лапіцкі. Сёлета Жодзінскі гарвыканкам прыняў чарговае (другое за апошнія чатыры гады) рашэнне спыніць навучанне Янкі Лапіцкага ў Жодзінскай гімназіі № 1 і прымусова перавесці яго на рускамоўнае навучанне, абгрунтаваўшы гэта неабходнасцю «рацыянальнага выкарыстання бюджэтных сродкаў». Сям'я Лапіцкіх заяўляе, што суду, дзе разглядаецца іх справа, папярэднічаў ціск і запалохванне з боку ўладаў.

Паводле інфармацыі старшыні Таварыства беларускай школы Алеся Лозкі, штогод колькасць беларускіх школ змяншаецца прыблізна на адзін працэнт. У мінулым навучальным годзе толькі 20,9 працэнта школьнікаў навучаліся ў школах з беларускай мовай навучання. У 1993/1994 навучальным годзе бацькі ахвотна прыводзілі сваіх дзяцей у першыя класы з беларускай мовай навучання. Толькі ў Мінскай вобласці іх было 92,6 працэнта, цяпер гэтая планка ніжэй за 18 працэнтаў.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# КОШТ ІМПЕРСКАГА СІНДРОМУ

Сяргей НІКАЛЮК

**Выдаткі адных — гэта адначасова і прыбыткі другіх. Гэты прынцып справядлівы не толькі на побытавым узроўні, але і на геапалітычным.**



Пачну з анекдота. Вядуць асуджанага на пакаранне смерцю. Ён пытае: «Які сёння дзень?» — «Панядзелак». — «Нішто сабе, як тыдзень пачынаецца!»

Пагадзіцеся, штосьці падобнае адбылося і з планамі Улады. Пад Новы год яна ўзгадала пра сваё абяцанне ўзняць да канца пяцігодкі заробак сярэднестатыстычнага беларуса да 500 «зялёных». Мазгамі паварушыла, на канцылярскіх лічыльніках косткі туды-сюды перакінула і вырашыла, што росту ВУП на 11–13 працэнтаў для гэтага будзе дастаткова. Столькі і запланавала. А тут і сусветны фінансава-эканамічны крызіс, здаецца, скончыўся. Прынамсі, так Уладзе здалося.

Але надышоў студзень, а з ім і новыя ўмовы пастаўкі расійскай нафты. Эканамісты падлічваюць, колькі мільярдаў усё тых жа «зялёных» гэтыя новыя ўмовы будуць каштаваць беларускай эканоміцы. Атрымліваецца — ад 2,5 да 4, у залежнасці ад тэмпераменту эканаміста.

Нішто сабе, як год пачынаецца! Кіраўніку Нацбанку Пятру Пракаповічу 27 студзеня на прэс-канферэнцыі на гэты конт засталося толькі развесці рукамі і ўразіць журналістаў прызнаннем: «Мы гэтага не чакалі». Ну проста як Юлій Цэзар у міністэрскім спектаклі Віктара Шэндэровіча: «І ты, Брут?» — «І я». — «Не чакаў!» — «Сюрпрыз».

## Прадуманая, шматхадовая, імперская

Але вернемся да новых умоў пастаўкі нафты. Сябар сойму Партыі БНФ Вінцук Вячорка, напрыклад, палічыў іх «вынікам прадуманай шматхадовай імперскай палітыкі Масквы і пройгрышам палітыкі Лукашэнкі». У тым, што Лукашэнка, прынамсі, не выйграў, сумнявацца не даводзіцца, але вось характарыстыка «імперская» ў дачыненні да палітыкі Масквы вымагае пэўнага каментару.

Паводле падпісанай дамовы, 6,3 мільёна тон нафты беларусы атрымаюць без экспартнай мыты, за астатнія 15 мільёнаў плаціць давядзецца па поўнай праграме, і праграма гэта на 1 лютага прадугледжвае выплату дадаткова 270,7 долара за кожную тону. Думаю, і без эканамічнай адукацыі канчатковы вынік падлічыць нескладана, калі знойдзецца калькулятар пад рукой.

І вось тут хацелася б задаць чытачам пытанне на кемлівасць. Якая частка нафты будзе пастаўлена ў Беларусь у адпаведнасці з імперскай палітыкай Масквы — тая, што абкладаецца мытам, або тая, што не абкладаецца? Не спяшаецеся з адказам. Я прапаноўваю своеасаблівую падказку-маячок.

Скіруем свой позірк на адну з нафтаздабываючых краін, напрыклад, Нарвегію. Падазраваць яе ў імкненні праводзіць прадуманую шматхадовую імперскую палітыку ў дачыненні да Беларусі, нават маючы хворае ўяўленне, даволі складана. Дапусцім, адзін з беларускіх НПЗ вырашыць закупіць у Нарвегіі нафту. Якая верагоднасць, што нашчадкі суровых вікінгаў пагодзяцца прадаць яе без экспартнай мыты? Пытанне наіўнае да дурасці. Нават калі дэлегацыю ўзначаліць галоўны беларускі перагаворшчык, першы намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір Сямашка, разлічваць на поспех няма ніякага шанцу.

У лістападзе мінулага года, сустракаючыся з беларускімі журналістамі, прэзідэнт Расіі паведаміў, што, «па падліках экспертаў, з моманту здабыцця Беларуссю незалежнасці аб'ем расійскіх прэферэнцый у выглядзе палёгкавых коштаў на сыравінныя рэсурсы склаў 50 мільярдаў долараў». Тое, што беларускія незалежныя эканамісты называюць «датацыямі», расійскі прэзідэнт — «прэферэнцыямі». Гучыць не так крыўдна, але сутнасць ад гэтага не мяняецца, як не мяняецца і сума ў 50 мільярдаў долараў. Менавіта ў гэтую суму і абышлася расійскай эліце і расійскаму грамадству імперская палітыка, але я б не назваў яе прадуманай і шматхадовай.

## Імперыя імперыі розніца

Ад канстатацыі факту пяройдзем да азбукавага паліталагічнага аналізу, мэта якога — зразумець прыроду расійскіх прэферэнцый/датацый.

У тым, што Расія з'яўляецца імперыяй, сумнявацца не даводзіцца. Аднак навука ведае два тыпы імперый: традыцыйныя і каланіяльныя. Апошнія маладзей за першыя. Яны паўсталі ў XVIII–XIX стагоддзі ў лідзіруючых дзяржавах Еўропы і спынілі сваё існаванне ў 60-х гадах мінулага стагоддзя.

Калі казаць сучаснай мовай, каланіяльныя імперыі — гэта тыповыя бізнес-праекты, якія распрацоўвалі і ажыццяўлялі эліты нацыянальных еўрапейскіх дзяржаў. Заўсёды мэта падобных праектаў — атрыманне прыбытку з каланіяльных, як правіла, заморскіх тэрыторый.



Тут самы час звярнуцца да цытавання: «Каланіяльныя імперыі развіваюць калоніі выключна настолькі, наколькі гэта неабходна для выпампоўвання з іх рэсурсаў, для рашэння задач кіравання і ўтрымання ўлады. Гэта датычыцца і інфраструктуры, і кадраў, і прамысловасці, і культуры» (Ігар Якавенка, культуролаг). На пэўным этапе ў калоніях пачынаюць фармавацца нацыянальна-вызваленчыя рухі. З гэтай прычыны баланс прыбыткаў і выдаткаў становіцца адмоўным. З гэтага моманту каланіяльныя імперыі асуджаныя.

У адрозненне ад каланіяльных, традыцыйныя імперыі заўсёды ствараліся дзеля прасоўвання нейкай трансцэндэнтнай мэты. Расійская імперыя несла заваяваным народам ідэю праваслаўя, Савецкая — ідэю камунізму. За права несці заваяваным народам ідэю метраполія вымушана плаціць. Таму няма нічога дзіўнага, што ў гісторыі Расіі, як адзначае ўжо цытаваны вышэй культуролаг, «з моманту заваявання Сярэдняй Азіі не было ніводнага года, калі сума падаткаў і прыбыткаў казны хоць бы зраўнялася з сумай выдаткаў на ўтрыманне калоніі».

У гады перабудовы ў нашых паўднёвых суседзяў было папулярнае пытанне наконт украінскага сала, якое быццам хтосьці з'еў. Нацыянальнасць галоўнага едака пры гэтым у таямніцы не трымалася. Аднак перабудова прайшла, а рынкавыя кошты засталіся, і адразу стала зразумела, хто ж на самай справе і ў якой колькасці еў чужое сала.

Традыцыйныя імперыі (Атаманская, Аўстра-Венгерская і інш.) не перажылі першай сусветнай вайны. Яны развалі́ліся пад ціскам нацый, якія зараджаліся ў іх нетрах. Развалілася і Расійская імперыя, але бальшавікі здолелі яе аднавіць, хай і не ў поўным аб'ёме. Прычына павароту кола гісторыі назад ляжыць на паверхні — яна ў слабасці нацыянальных рухаў. Невыпадкова да абноўленай імперыі не атрымалася далучыць заходнія правінцыі (Польшчу, Фінляндыю, Прыбалтыку, Бесарабію), г. зн. тэрыторыі, на якіх працэс фармавання нацый да таго часу быў найбольш паспяховым.

| ПРЫБЫТКІ КАНСАЛІДАВАНАГА БЮДЖЭТУ, % ВУП | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1995 | 2001 | 2002 | 2003 | 2004 | 2005 | 2006 | 2007 | 2008 | 2009* |
| 29,2 | 33,0 | 33,4 | 44,1 | 47,4 | 47,4 | 48,4 | 49,6 | 51,2 | 44,9 |

* за студзень-лістапад

Сучасная Расія — апошняя з традыцыйных імперый, што захаваліся. Ад сваіх папярэдніц яна адрозніваецца адсутнасцю ідэі. Мэтанакіраваныя спробы яе «знайсці» ні да чаго не прывodзілі. Але калі за права прасоўваць сваю ідэю даводзіцца плаціць, то за права ўтрымліваць народы ў сферы свайго ўплыву плаціць мусіш у падвойным памеры, што сёння і назіраецца. Дастаткова ўзгадаць Чачню, на ўтрыманне якой з федэральнага бюджэту штогод выдаткоўваецца больш за 2 мільярды долараў, балазе ёсць нафтавая і іншая прыродная рэнта.

Агучаная расійскім прэзідэнтам сума прэферэнцый/датацый — з той жа оперы. Дык якія ж мы маем надзеі на іх пралангацыю, і ці варта чакаць палітыкі аншлюсу ў дачыненні да Беларусі?

Што да прэферэнцый/датацый, дык у сярэднетэрміновай перспектыве іх аб'ем будзе дыктавацца дынамікай сусветнага крызісу. Узровень імперскіх прэтэнзій Расіі заўсёды наўпрост залежаў ад колькасці рэсурсаў, якія Крэмль мог выкарыстаць для забеспячэння працэсу «ўставання з кален». Знакамітыя словы Ельцына: «Бярыце столькі суверэнітэту, колькі зможаце праглынуць», — відавочнае пацвярджэнне гэтага. На двары тады стаяў жнівень 1990 года, і дзяржаўная казна была пустая.

А вось наконт аншлюсу паспяшаюся супакоіць. І пры 140 доларах за барэль нафты да палітыкі знешняй экспансіі справа не дойдзе. Максімум, на што сёння здольная расійская эліта, — гэта стварыць санітарны кардон супраць заходніх уплываў. Таму мы і назіраем такую хваравітую рэакцыю на ўдзел Беларусі ў праграме «Усходняе партнёрства».

## Палітычная мігрэнь

Не буду адмаўляць: пасля рэферэндуму 1996 года, які перакроіў Канстытуцыю, я спадзяваўся, што вецер дэмакратычных зменаў можа падзьмуць на Беларусь і з Усходу. Маю надзею спарадзіла неразуменне азбукавай ісціны: слабая дэмакратыя вельмі падобная да слабога аўтарытарызму. Я прыняў жаданае за сапраўднае, але, як кажа прыказка, «нарадзіцца дурным не сорамна, сорамна памерці дурнем», таму давялося патраціць не адзін год, каб пазбавіцца ад паліталагічных ілюзій.

Кожны ўрад мае патрэбу ў грошах. Адсюль падаткі, але адсюль і галоўны боль любога сучаснага ўрада — падаткаплатнікі. У наш час з іх патрэбамі і запытамі даводзіцца лічыцца, таму існуе наўпроставая залежнасць паміж узроўнем дабрабыту насельніцтва і ўзроўнем дэмакратыі. Але з гэтага правіла выпадаюць краіны, якія Бог шчодра надзяліў прыроднымі рэсурсамі. У 2007 годзе ВУП на душу насельніцтва па парытэце пакупной здольнасці склаў у Расіі 13 432 долара. Нароўні з нафтавымі Эміратамі Расія ўваходзіць у лік найбагацейшых сучасных не-дэмакратый.

Мне запярэчаць, а як жа Нарвегія? Сапраўды, па аб'ёме экспарту нафты яна трывала размясцілася сярод сусветных лідэраў, але здолела пры гэтым падзяляць агульнаеўрапейскія каштоўнасці. Нарвегія — асаблівы выпадак. У палітыцы, у адрозненне ад матэматыкі, змяненне месцамі складовых здольнае змяніць суму. У Нарвегіі нафту дадалі да дэмакратыі, паколькі яе позна адкрылі, а не наадварот — дэмакратыю да нафты.

У Беларусі нафты няшмат, але ёсць калійныя солі, а галоўнае — расійскія прэферэнцыі/датацыі, аб'ём якіх дазваляў Лукашэнку на працягу шаснаццаці гадоў выконваць сацыяльныя абавязанні. Звернемся да табліцы. У далёкім 1995 годзе прыбыткі кансалідаванага бюджэту не дацягвалі да 30% ВУП. За 7 гадоў нічога прынцыпова не змянілася, але ў 2003 годзе адбыўся скачок адразу на 9,7 пункта.

Адкуль такая бюджэтная дабрадаць? Яна з «нафтавага афшору». Але — звярніце ўвагу, — атрымаўшы дадатковую крыніцу прыбыткаў, Улада не знізіла падаткі суб'ектам гаспадарання. Права распараджацца дадатковымі прыбыткамі яна пакінула за сабой. Ці варта пасля гэтага дзівіцца высокаму рэйтынгу Лукашэнкі. Гэта ж ён падвышае зарплату бюджэтнікам, пенсіі пенсіянерам і стыпендыі студэнтам (спіс можна працягнуць).

Праблема, аднак, у тым, што такая палітыка спараджае ўтрыманства, узровень якога ўвесь час узрастае. А вось магчымасць канцэнтраваць рэсурсы, наадварот, зніжаецца (глядзі табліцу). Адсюль галоўны боль беларускай улады, і без анестэзіі ў выглядзе імперскіх амбіцый Расіі ад яе ў сярэднетэрміновай перспектыве не пазбавіцца.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# КРАІНА СВАБОДНАГА ВЫБАРУ

Генадзь КЕСНЕР

**Украіна абрала новага прэзідэнта. Як адзін з назіральнікаў ад CIS-EMO (Міжнароднай арганізацыі па назіранні за выбарамі ў краінах СНД), магу засведчыць, што гэта выбарчая кампанія прайшла дастаткова дэмакратычна і празрыста, а тыя парушэнні, якія былі адзначаны і без якіх не абысціся ў любой краіне, не паўплывалі на выніку галасавання. Але хацелася б сказаць і пра іншае.**

Цяпер, калі з украінскімі прэзідэнцкімі выбарамі ўсё ўжо больш-менш ясна, варта адзначыць не вельмі прыгожыя паводзіны падчас кампаніі і дэпутатаў Вярхоўнай рады, і палітыка, які апошнія пяць гадоў кіраваў Украінай і якога многія лічылі «гарантам дэмакратыі». Гаворка ідзе пра Віктара Юшчанку. Тое, што адбылося паміж першым і другім турам прэзідэнцкіх выбараў, не ўпісваецца ў рамкі дэмакратычнай дзяржавы. Ну не магу я сабе ўявіць, каб у цывілізаванай дзяржаве выбарчае заканадаўства мянялася, прычым істотна, паміж двума турамі адной кампаніі.

Тыя змены, у сутнасць якіх тэрмінова давялося ўнікаць назіральнікам (ды і самім удзельнікам выбарчай кампаніі), насілі прынцыповы характар і стварылі падмурак для фальсіфікацыяў, якія цяпер могуць быць апраўданы законам, бо ён дае дзеля гэтага вялікія магчымасці. Так, заканадаўцы адмянілі кворум на пасяджэннях участковых выбарчых камісій, што дазваляе кожнаму з бакоў правесці сваё пасяджэнне, скласці пратакол і падаць яго ў тэрытарыяльны выбаркам з патрэбным часткі першаснай камісіі вынікам галасавання. Тое ж можа зрабіць і другая частка ўчастковага выбаркаму. І што рабіць далей?

Апроч таго, пратакол участковай камісіі цяпер можа быць прызнаны сапраўдным, калі яго падпісаў нават адзін сябар выбаркаму. І нават калі, урэшце, гэты самы выканкам будзе складацца з адначо толькі таго самага сябра. Каментар залішні.

Яшчэ адно новаўвядзенне — галасаванне «на даму» без прадастаўлення дакументаў, якія сведчаць пра неабходнасць такога заходу выбаршчыка. Раней ён мусіў прадаставіць участковай камісіі абгрунтаванне немагчымасці свайго з'яўлення на выбарчым участку. І ёсць яшчэ




шэраг навацыяў, якія адкрываюць дадатковыя магчымасць зрабіць выбарчы працэс менш празрыстым.

Але самае дзіўнае — нават не пункце паправак у выбарчае заканадаўства, а тое, з якой хуткасцю (праз дзве гадзіны!) падпісаў гэты спрэчны дакумент прэзідэнт Юшчанка. Такой маланкавасці ў найважнейшым пытанні з боку кіраўніка дзяржавы не чакаў ніхто. Практычна ўсе еўрапейскія структуры рэзка выступілі супраць змянення заканадаўства ў разгар выбарчай кампаніі, але ні на ўкраінскага прэзідэнта, ні на парламент гэта не паўплывала.

Падчас размоваў з назіральнікамі, з журналістамі, з сябрамі выбаркамаў, рабілася зразумелым, што толькі недахоп часу не дазволіў першасным выбаркамам «перабудавацца», таму склад камісій да самага апошняга моманту застаўся кворумным, парытэтным (кожны з кандыдатаў у прэзідэнты меў у выбаркамах палову ад складу камісій). Назіральнікі ад бакоў удзельнікаў на абсалютнай большасці ўчасткаў (прынамсі, у Львове і Львоўскай вобласці) заявілі, што не маюць прэтэнзій да ходу галасавання. Празрыстыя скрыні для галасавання, па меншай меры, да пачатку працэсу волевыяўлення людзей і падчас яго, выключалі магчымасць укідвання бюлетэняў.

Былі і адмоўныя з'явы. Напрыклад, у некаторых рэгіёнах Украіны адбыліся падпалы выбарчых участкаў; у асобных абласцях краіны выбаршчыкаў абзвоньвалі ад імя выбаркамаў і раілі ставіць адзнаку на супраць прозвішча пажаданага грамадзяніну кандыдата, а прозвішча другога выкрэсліваць, а гэта, паводле заканадаўства, аўтаматычна зрабіла б бюлетэнь несапраўдным. І яшчэ былі пэўныя моманты, якія, аднак, сур'ёзна не паўплывалі на выніку выбараў.

Атмасфера ў дзень галасавання, прынамсі ў Заходняй Украіне, была спакойнай. Людзі без прымусу ішлі галасаваць, шмат хто — адразу пасля заканчэння набажэнстваў. Актыўнасць выбаршчыкаў у некаторых раёнах была нават большай, чым у першым туры, больш за 60 працэнтаў.

Нягледзячы на тое, хто будзе кіраваць дзяржавай наступную пяцігодку, можна быць упэўненым, што звароту да таталітарызму ва Украіне не будзе, і падчас наступнай кампаніі ўкраінцы змогуць зноў зрабіць свой свядомы выбар. У іх, у адрозненне ад Беларусі, такая магчымасць ёсць. І магчымасць гэта, як бы хто таго не адмаўляў, была закладзена менавіта ў 2004 годзе «памаранчавым» Майданам.

УРАЖАННІ

# ФЛЕГМАТЫЧНЫ ВЫБАР

Вольга ХВОІН

**Перад ад'ездам на выбары ва Украіну ў думках разпораз паўставалі вобразы палітычнай драмы мінулай кампаніі — усеагульная заангажаванасць, прыхільнасць да таго ці іншага кандыдата, вулічныя спрэчкі, мітынгі, аранжавая ці сіняя атрыбутыка на ўсіх і ўсім, ад мінакоў-манахаў да прысадаў уздоўж дарог.**

За два дні да выбараў Львоў сустрэў спакоем і сваім будзённым жыццём, якое ніяк не парушалі рэдкія плакаты з выявамі кандыдатаў на прэзідэнцкую пасаду ды надпісам: «Вони однакові».

Ні мітынгаў, ні сцягоў, ні палымяных прамоў. На адной з цэнтральных плошчаў Львова самотна стаялі два намёты. У адным, па задуме, мусілі агітаваць за Юлію Цімашэнка, але ахвочых заангажавацца побач не назіралася. У другім раздавалі газету нацыяналістычнай «Украінскай партыі» з артыкулам пра «апошні мужны ўчынак прэзідэнта» — ушанаванне Сцяпана Бандэры Героем Украіны. Дарэчы, плакаты на гэту тэму з тэзісам: «Нарэшце гэта адбылося» трапляліся на вочы ці не часцей за агітпрадукцыю Цімашэнка і Януковіча.

## Абразы на кабінках

У нядзелю з раніцы на выбарчых участках невялікага мястэчка Гарадок пад Львовам было нялюдна. «Нічога, хутка людзі, моладзь пойдуць з царквы, то будзе больш народу», — тлумачыў сябра выбарчай камісіі, былы вайсковец і прадстаўнік Партыі рэгіёнаў Алег Вендзібура. Уніяцкая Львоўшчына надзвычай набожная — да царквы ходзяць не толькі старэйшыя, але і моладзь. Фактычна на кожным выбарчым участку мястэчка на бачным месцы вісеў абраз. На адным участку выяву святога змясцілі на кабінкі для галасавання, відаць, у спадзяванні, што Бог дапаможа зрабіць украінцам няпросты выбар паміж двума палітыкамі, бо вялікай розніцы яны ў кандыдатах не бачаць: «Выбіраем з двух аднолькава кепскіх».

У Гарадку раней месцілася ваенная частка, і былыя вайскоўцы трапляліся ў некалькіх выбарчых камісіях. Усе наракалі на адсутнасць працы ды парадку. «А я прывык, каб строга было, дысцыпліна — гаворыць Алег Вендзібур. — У першым туры галасаваў за Яцэнюка. Харошы мужык, але малады. Можа, яшчэ падрасце».

Па выніках другога туру Львоўшчына аддала больш за 90 працэнтаў галасоў за Юлію Цімашэнка. У першым на многіх участках Віктар Юшчанка і Юлія Цімашэнка ішлі побач, вынікі адрозніваліся літаральна ў некалькі галасоў. Пакуль яшчэ дзейснага кіраўніка Украіны тут падтрымліваюць, хаця і гавораць пра разбітыя ідэалы і спадзяванні.

## Каб так лёгка было жыць

І праўда, па абедзе людзей на ўчастках пабольшала. Але на агульную абыякава-спакойную атмасферу электаральнага працэсу гэта не ўплывала. Людзі бралі бюлетэнь, кідалі яго ў празрыстую скрынку і сыходзілі. Ні традыцыйных для Беларусі буфетаў, ні адчування свята. Найбольш адказнае, як і ў Беларусі, — старэйшае пакаленне. Толькі ўкраінцы вераць, што будучыня залежыць ад іх голасу. «Каб так лёгка было жыць, як галасаваць», — рэзюмавала кабета, апускаючы свой бюлетэнь у скрынку. Пажылыя прыходзілі ў суправаджэнні сяброў ці сваякоў. Хто не можа дайсці да ўчастку самастойна, прасілі, каб да іх прыехалі дадому.

Працэс галасавання адкрыты і празрысты. Камісіі сфарміраваныя з прадстаўнікоў ад Юліі Цімашэнка і Віктара Януковіча. Ад іх жа і назіральнікі на кожным участку. Гаварылі, што і ў камісіях і сярод назіральнікаў многа беспрацоўных. Для людзей выбары — шанец зарабіць за дзень блізу 80 долараў. Перад выездам на ўчасткі папярэджвалі, што ад назіральнікаў можна даведацца пра прэтэнзіі да арганізацыі працэсу галасавання, інфармацыю з «перчыкам» пачуць. Але насамрэч з абодвух бакоў людзі былі стрыманымі і ветлівымі, брудам нікога не палівалі, істотных парушэнняў не адзначалі.

У любы момант назіральнікі могуць даведацца ў старшыні камісіі, колькі людзей ужо прагаласавала, колькі было заяў прагаласаваць дома. На адным з участкаў старшыня камісіі звярнулася да назіральнікаў і сябраў камісіі з просьбай дазволіць мужчыну, які кепска бачыць, зайсці ў кабінку ў суправаджэнні жонкі. На другім дэманстратыўна разварочвалі тых, хто пабытаў, на якім участку мусіць аддаць свой голас за новага кіраўніка дзяржавы. Прынеслі скрынку з выязнога галасавання. «Былі заяўленыя да галасавання 21 асоба, — гучна абвяшчае старшыня камісіі. — 20 прагаласавала, адзін памёр». На выездзе з участка нам трапляецца на вочы пахавальнае шэсце. Такі тэатр жыцця.

## Бацька — пахан

Беларусь ва ўяўленні стомленых ад палітычных сварак украінцаў паўстае ледзь не эдэмам зямным. Тут і парадак, і праца, і заробкі ў некалькі тысяч долараў, і машыны з Еўропы без мыта. «Гарны ў вас прэзідэнт, дый краіна добрая», — такімі словамі сустракалі ледзь не на кожным выбарчым участку. Украінцы мараць пра матэрыяльны дабрабыт ды новыя працоўныя месцы і думаюць, што гэта можа прынесці толькі кіраўнік з моцнай уладнай рукой. «За Юлю галасаваць не буду, — тлумачыць старшыня выбарчай камісіі спадарыня Пілат. — Ведаю ж, пра што жанчына думае: пра футра новае, залацішка, мужа багатага. А мужык па сталу кулаком лясную — і парадак у хаце».

Малады беспрацоўны доктар, што мае сям'ю з двума дзецьмі, з запалам гаворыць: «Лукашэнка — пахан! Яго ўсе баяцца, я б за такога адразу прагаласаваў». Пытаемся, за што сям'ю ўтрымлівае, дык гаворыць, што маці ў яго на заробках у Еўропе, дасылае грошы. Увогуле, з Заходняй Украіны многа людзей з'язджае на працу ў Італію, Іспанію, Аўстрыю. Пераважна са старэйшага пакалення, бо праца тая некваліфікаваная, і моладзь не надта хоча даглядаць састарэлых еўрапейцаў ці мыць посуд у кавярнях. Настаўнікі наракаюць, што бабулі ды дзядулі не спраўляюцца з выхаваннем пакінутых на іх рукі дзяцей. Але іншага выйсця няма, бо працу ў Гарадку знайсці цяжка.

Дырэктарка школы, дзе арганізаваны выбарчы ўчастак, з адабрэннем гаворыць пра Беларусь, але як толькі чуе пра нашу кантрактную сістэму для настаўнікаў ды яе наступствы, з абурэннем выгуквае: «Бач што прыдумалі! І слова не пікнеш цяпер». Настаўнік гісторыі з гэтай жа школы, разважаючы пра палітычную сістэму Беларусі, правёў паралель, што і Гітлер з Мусаліні некалі таксама пачыналі з эканамічнага ўздыму, але скончылася гэта нядобра.

Пасля закрыцця ўчасткаў ужо ў львоўскай кавярні падумала, што беларусам вынікі выбараў больш цікавыя, чым самім украінцам. Мясцовыя спакойна пацягвалі піва-гарбату, не надта зважаючы на апошнія звесткі ЦВК, што трансляваліся па тэлебачанню. Выбар зроблены. Ці будзе за яго сорамна ўкраінцам, пабачым праз пяць гадоў.

СПРАВА

# РЭАЛЬНЫХ ДОКАЗАЎ НЯМА

**Год таму, 8 лютага, у Ваўкавыску былі арыштаваныя прадпрымальнік Мікалай Аўтуховіч, ягоны кампаньён Юрый Лявонаў і былы супрацоўнік падатковай інспекцыі горада Уладзімір Асіпенка. Аўтуховіч і Асіпенка да гэтага часу знаходзяцца за кратамі.**



Для арышту Аўтуховіча, Лявонава і Асіпенкі ў Ваўкавыск з Мінску прыбыў атрад спецназу міліцыі. Сярод тых, хто першым паведаміў пра арышты, быў праваабаронца Алег Волчак. Ён і Мікалай Аўтуховіч — ветэраны-афганцы, якія ў свой час адмовіліся ад юбілейных медалёў.

«Справа заведзена незаконна, — лічыць Алег Волчак. — Падстаў для гэтага не было. Гэтак жа незаконна трымаюць пад вартай Аўтуховіча і Асіпенку, рэальных доказаў няма і не будзе — працэс гэты выключна палітычны. Магчыма, камусьці з афіцыйных асобаў гэта не падабаецца, але мы лічым, што ў гэтай справе нічога няма. З-за гэтай справы ўжо пацярпелі два адказных чыноўнікі. Гэта былы міністр унутраных спраў Навумаў і старшыня Гродзенскага аблвыканкама Саўчанка, якіх адправілі ў адстаўку. А Мікалай Аўтуховіч цягам апошніх 7–8 гадоў паўсюдна казаў, што ў Гродзенскай вобласці існуе карупцыя вышэйшых асобаў. Зараз па Гродна ідуць праверкі, даследуецца датычнасць чыноўнікаў да карупцыі. А самога Аўтуховіча працягваюць трымаць у зняволенні».

Крымінальная справа ў дачыненні да Аўтуховіча і Асіпенкі прынятая да судаводства Вярхоўным судом Беларусі, куды яна была перададзена 30 снежня 2009 года.

Адвакат Уладзіміра Асіпенкі Тамара Сідарэнка, якая наведала падабароннага 5 лютага, паведаміла: «Выявілася, што пра рух сваёй справы ён ведае больш, чым адвакаты. Ён атрымаў паведамленне за подпісам старшыні Вярхоўнага суда аб тым, што дата разгляду справы прызначаецца на працягу двух месяцаў. Паколькі справа ў суд была перададзена 30 снежня, то ў канцы лютага будзе вядома дата пачатку суда. Хутчэй за ўсё, суд над Аўтуховічам і Асіпенкам можа пачацца ў другой палове сакавіка».

Але, паводле яе слоў, адвакатам у судзе нічога не паведамляюць.

Нагадаем, затрыманым 8 лютага 2009 года ваўкавыскім прадпрымальнікам Мікалаю Аўтуховічу, Юрыю Лявонаву і Уладзіміру Асіпенку 18 лютага было выстаўлена абвінавачанне на падставе артыкула 218 Крымінальнага кодэкса. 23 чэрвеня ў дачыненні да Аўтуховіча і, як паведаміла МУС, «іншых асоб» была распачата справа згодна з артыкулам 359 Крымінальнага кодэкса (тэрарыстычны акт) у выглядзе падрыхтоўкі (артыкул 13). Абвінавачанне ў падрыхтоўцы тэрарыстычнага акта Асіпенку і Аўтуховічу было выстаўлена 20 лістапада. 8 жніўня Лявонава вызвалілі з мінскага следчага ізалятара, а 24 верасня з яго былі зняты ўсе абвінавачанні.

Праваабаронцы лічаць затрыманых палітычнымі зняволенымі, звяртаюць увагу на тое, што Аўтуховіч і Лявонаў раней ужо былі судзімыя і прызнаныя міжнароднай супольнасцю вязнямі сумлення. У студзені 2010 года міжнародная праваабарончая арганізацыя «Human Rights Watch» заявіла, што Аўтуховіч, Лявонаў і Асіпенка былі арыштаваны па палітычна матываваных справах.

20 студзеня ў Мінску генеральны пракурор Беларусі Рыгор Васілевіч паведаміў, што слуханне крымінальнай справы ў дачыненні да Аўтуховіча і Асіпенкі будзе адкрытым. 28 студзеня пра гэта ж заявіў кіраўнік МУС Анатоль Куляшоў.

СУД

# ШЭСЦЬ ГАДОЎ — ЗА ПАЛЕЦ

**У Кастрычніцкім судзе Віцебска працягваецца разбор справы дэмакратычнага актывіста Алега Сургана. Яго вінавацяць у тым, што ён укусіў міліцыянта за палец. Паводле Крымінальнага кодэкса, гэта кваліфікуецца як напад на супрацоўніка міліцыі, за які магчымае пакаранне — да шасці гадоў турмы.**

Пацярпелы, супрацоўнік Кастрычніцкага РАУС Сяргей Дудкевіч цвердзіць, што падчас затрымання 3 верасня Сурган укусіў яго за мезенец левай рукі. За гэта міліцыянт хоча атрымаць адзін мільён кампенсацыі маральнага ўрону.

9 лютага на судзе міліцыянт Дудкевіч заявіў, што яго ўкусілі, калі ён трымаў Алега Сургана за галаву, бо той нібыта імкнуўся нанесці самому сабе цялесныя пашкоджанні: «Біўся галявой аб дзверы міліцэйскай машыны і знарок цёрся тварам аб дыванок пад нагамі».

Падсудны кажа, што супрацоўнікі міліцыі павалілі яго на падлогу ў машыне і збівалі нагамі, потым працягвалі катаваць і здзекавацца ўжо ў РАУС. Калі яму стала дрэнна, міліцыянты мусілі выклікаць хуткую дапамогу, і медык зафіксавалі сінякі і драпіны на твары ды на руках.

Алег Сурган лічыць, што гісторыю з укусам за палец міліцыянты выдумалі пасля таго, як ён паскардзіўся на збіццё і катаванні ў пракуратуру — невыпадкова на медычную экспертызу супрацоўнік міліцыі Сяргей Дудкевіч накіраваўся толькі 30 верасня, амаль праз месяц пасля «ўкусу да крыві».



Нагадаем, 3 верасня Алега Сургана і ягонага малодшага брата Тараса, актывіста «Маладой Беларусі», міліцыянты затрымалі на праспекце Фрунзе ў Віцебску. Там быў вывешаны бел-чырвона-белы сцяг. У Тараса Сургана пры сабе быў пашпарт, і яго ў пастарунак не павезлі. На Алега Сургана ў пастарунку спачатку склалі пратакол за вывешванне сцяга, але ён некуды знік, і ў справе больш не фігуруе.

Тарас Сурган, якога раней неаднаразова затрымлівалі і каралі за бел-чырвона-белыя сцягі, лічыць крымінальны пераслед ягонага брата свядомым жаданнем міліцыянтаў любым коштам спыніць несанкцыянаваныя акцыі ў Віцебску.

Ад 27 студзеня Алег Сурган знаходзіцца ў следчым ізалятары. Рашэнне пра тое, што ён небяспечны для грамадства, прынялі ў Кастрычніцкім РАУС горада. Там, дарэчы, працуе міліцыянт Дудкевіч.

## КАЛОНКА ЮРЫСТА

# НАРАДЗІЦЬ ДЗІЦЯ, ПАБУДАВАЦЬ ДОМ

**У гэтым годзе мы працягваем публікацыю адказаў вядомага юрыста і праваабаронца Алега Волчака на пытанні асобаў, якія звярнуліся ў грамадскую прыёмную.**



- *Увосень набыў на сваё імя аўтамабіль. Частку неабходнай сумы дала жонка з умовай, што я ёй вярну гэтыя грошы, а яна не будзе прэтэндаваць на аўтамабіль. Зараз грошы ў мяне ёсць, і я гатовы іх аддаць, але цяпер мы знаходзімся ў стадыі разводу. Падкажыце, як мне юрыдычна правільна вярнуць грошы жонцы, але ў той жа час замацаваць яе адмову ад прэтэнзій на машыну?*
  *Лінскі М. Ф., Мінск*

Складзіце шлюбную дамову, у якой вызначце, каму будзе належаць аўтамабіль (магчыма, і ўся маёмасць) пасля разводу. Таксама па такой дамове можна падзяліць маёмасць, нават не скасоўваючы шлюб, г. зн. юрыдычна вы знаходзіцеся ў шлюбе, але маёмасць ужо падзеленая паміж вамі. А потым можаце аддаваць грошы.

- *Я грамадзянка Украіны. У мяне часовы дазвол на знаходжанне ў РБ тэрмінам на 1 год. Віда на жыхарства пакуль няма. Мой муж — грамадзянін Беларусі, беспрацоўны. Мы чакаем дзіця. Нараджаць я буду тут. Усе медыцынскія паслугі я аплачваю. Ці маю я права на атрыманне дапамогі па цяжарнасці і родах у Рэспубліцы Беларусь, а таксама дапамогі па догляду за дзіцём?*
  *Кучук І. А., Гродна*

Права на дзяржаўную дапамогу сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, маюць сем'і грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія стала пражываюць у Рэспубліцы Беларусь.

- *Маёй дачцэ даслалі апавяшчэнне пра скасаванне працоўнага кантракту ў сувязі з тым, што яе прадпрыемства злілося з прадпрыемствам іншага ўласніка. Мая дачка цяпер знаходзіцца ў дэкрэтным адпачынку. Унучцы хутка будзе тры гады. Ці законныя дзеянні наймальніка?*
  *Гурыновіч Л. П., Віцебск*

Скасаванне працоўнай дамовы па ініцыятыве наймальніка з жанчынамі, якія маюць дзяцей ва ўзросце да трох гадоў, не дапускаецца, акрамя некаторых выпадкаў. Адзін з такіх выпадкаў — ліквідацыя арганізацыі, спыненне дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка. Аднак варта мець на ўвазе, што перадача арганізацыі з падпарадкавання аднаго органа ў падпарадкаванне іншага не з'яўляецца ліквідацыяй і не спыняе дзеяння працоўнай дамовы са згоды працаўніка. Пры змене ўласніка арганізацыі і рэарганізацыі (зліццё, далучэнне, падзел, вылучэнне, пераўтварэнне юрыдычнай асобы) працоўныя адносіны са згоды працаўніка працягваюцца і не патрабуюць пераафармлення, калі пры гэтым не адбываецца скарачэнне колькасці або штату працаўнікоў. Жанчыны, якія маюць дзяцей ва ўзросце да трох гадоў, не могуць быць звольненыя ў сувязі са скарачэннем штату.

Пры скасаванні працоўнай дамовы ў адпаведнасці з пазначанай вышэй падставай наймальнік абавязаны не менш чым за два месяцы пісьмова папярэдзіць працаўніка пра звальненне.

Пры спыненні працоўнай дамовы ў сувязі з ліквідацыяй арганізацыі выплачваецца выходная дапамога ў памеры не менш за трохкратны сярэднемесячны заробак. Паколькі выходная дапамога — гэта выплата, якая адносіцца да заработнай платы, то яна падлягае індэксацыі.

Таму мы раім вашай дачцэ звярнуцца ў суд і абскардзіць звальненне, а калі ёсць жаданне — аднавіцца на пасадзе. Іск можна скласці ў адвакатаў, пры гэтым за такія катэгорыі спраў дзяржпошліна не бярэцца.

- *Я член будаўнічага кааператыва. Нядаўна наш дом быў здадзены ў эксплуатацыю. Кіраўніцтва кааператыва заявіла нам, што за атрыманне пашпарту дома ў БРТІ нам усім трэба заплаціць па 280 тысяч рублёў. Я чула, што гэта сума павінна ўжо быць уключаная ў агульны кошт кватэры. Ці законная працэдура дадатковага збору грошай на тэхнічны пашпарт дома?*
  *Ірына Свірыдава, Мінск*

Вы цалкам маеце рацыю. У адпаведнасці з пунктам 12 Пастановы Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь ад 15 красавіка 2008 года № 18 Аб зацвярджэнні інструкцыі па вызначэнні кошту будаўніцтва аднаго квадратнага метра жылога дома ў базісным і бягучым узроўні цаны, у будаўніцтва жылога дому ўключаюцца выдаткі, якія не ўваходзяць у зводны каштарысны разлік кошту будаўніцтва, але якія адносяцца на кошт будаўніцтва. Выдаткі на атрыманне тэхнічнага пашпарта на дом належаць да такіх выдаткаў.

7

# TV ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## 15 ЛЮТАГА, ПАНЯДЗЕЛАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00** Навіны.
**06.05, 07.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.15, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** У свеце матораў.
**08.45** Слова мітрапаліта Філарэта на пачатак Вялікага паста.
**09.05** Nota Bene.
**09.35** «Зорныя танцы». Мужчынскі сезон. Перадача 1-я.
**11.05** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**12.05** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Дзённік Алімпіяды.
**12.30** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Фрыстайл. Мужчыны. Фінал.
**13.30** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Фігурнае катанне. Пары.
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Культурныя людзі.
**15.55** Меладрама «Сёстры па крыві».
**17.05** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.05** Відэафільм АТН «Лілія Пташук» цыкл «Лёгка сказаць».
**18.25** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Дзённік Алімпіяды.
**18.50, 01.15** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Арэна».
**19.55** Ток-шоў «Ход у адказ».
**21.00** Панарама.
**21.55** Адмысловы рэпартаж АТН «Прыкметны бізнэс».
**22.10** Алімпійскі часопіс.
**22.25** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Лыжныя гонкі. Мужчыны. Сноўборд. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**01.20** Дзень спорту.

### ОНТ

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00, 00.35** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Дыхание планеты».
**10.45** «Пышная пяцёрка».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.15, 00.50** Навіны спорту.
**11.10** «Пышная пяцёрка». Працяг.
**12.00** «Малахаў+».
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «У міры злачыннай страсці». Шматсерыйны фільм.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**18.20** Серыял «Мая выдатная няня».
**19.05** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**21.05** Ток-шоу «Выбар».
**22.00** Прэм'ера. «Застацца ў жывых». Шматсерыйны фільм. IV сезон. 4-я серыя.
**23.20** «Злачынствы стагоддзя».
**23.50** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.45** «Званая вячэра».
**12.40** «Былая». Серыял.
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** «Вялікі горад».
**15.30** «Гарачы лёд».
**16.00** «Культурнае жыццё».
**16.50** «Я - вандроўца».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Мінштына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.40** Фільм «Грахі нашы». Украіна, 2007 г.
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** «Вечныя мелодыі кахання». Канцэрт.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.30** Рамантычная камедыя «Інтуіцыя».
**12.05** «Пра мастацтва».
**12.30** Школа рамонту.
**13.30** Мультсерыял «Сямейка піратаў».
**14.20** Пазакласная гадзіна.
**14.35** Бухта капітанаў.
**15.15** Тэлебарометр.
**15.35** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ».
**16.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**19.40** «Калыханка».
**19.55** Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010. Лыжныя гонкі. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**21.40** Дэтэктыў «Вяртанне рэзідэнта» (СССР).
**22.55** Трагікамедыя «Графіці» (Расія).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Выпрабаванне на трываласць. Міхаіл Міль». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.25** «Ранішняя пошта».
**11.55** «Гукавая дарожка «Маскоўскага камсамольца».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.25** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**15.15** Тэлесерыял «Неадкладка».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.25** «Кулагін і партнёры».
**17.55** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.30** Тэлесерыял «Райскія яблычкі. Жыццё працягваецца».
**22.25** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**23.25** «Нічога асабістага».
**23.40** Навіны - Беларусь.
**23.50** «Весткі+».
**00.10** Прэм'ера. «Гарадок».

### НТВ

**07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.30** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд».
**09.00** «Праграма Максімум».
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.45** Дэтэктыўны серыял «МУР ёсць МУР».
**12.40, 18.20** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**13.30** Серыял «Тэрыторыя прыгажосці».
**15.10** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Мядзведжы кут».
**21.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Агент адмысловага прызначэння».
**23.40** «Сумленны панядзелак».
**00.30** «Школа зласлоўя».

### EUROSPORT

**04.00, 05.00, 09.25** Фігурнае катанне. Зімовыя Алімпійскія гульні. Пары. Кароткая праграма.
**04.45** Фрыстайл. Зімовыя Алімпійскія гульні. Могул.
**06.00, 12.00, 17.00** Біятлон. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. 10 км.
**07.30, 08.15, 09.15** Зімовыя Алімпійскія гульні. Навіны.
**07.40** Лыжнае дваяборства. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. 10 км.
**08.25** Горныя лыжы. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. Слалам/камбінацыя.
**11.00** Лыжнае дваяборства. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. 10 км.
**13.00, 16.00, 19.00** Зімовыя Алімпійскія гульні. Фінішная прамая. Часопіс.
**13.30** Фігурнае катанне. Зімовыя Алімпійскія гульні. Пары. Кароткая праграма.
**14.30** Лыжнае дваяборства. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. 10 км.
**15.00** Горныя лыжы. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. Слалам/камбінацыя.
**16.30** Лыжнае дваяборства. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. 10 км.
**18.00** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**19.30** Зімовыя Алімпійскія гульні. Зваротны адлік. Часопіс.
**20.00** Лыжныя гонкі. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. 10 км.
**21.15** Фігурнае катанне. Зімовыя Алімпійскія гульні. Пары. Кароткая праграма. Ванкувер (Канада).
**22.30** Лыжныя гонкі. Зімовыя Алімпійскія гульні. Індывідуальныя спаборніцтвы. 15 км.
**00.00** Сноўборд. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Сноубордкрос.
**01.15** Канькабежны спорт. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. 500 м.
**02.45** Фігурнае катанне. Зімовыя Алімпійскія гульні. Пары. Адвольная праграма.
**03.30** Канькабежны спорт. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. 500 м.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.10** Еўропа сёння.
**17.40** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.35** «Бульбаны», мультсерыял.
**18.40** Госць «Белсату».
**18.55** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**19.10** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.25** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.40** ПраСвет.
**20.00** Невядомая Беларусь: «Двое на Лысай гары», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**20.35** Прыватная калекцыя.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Фільматэка майстроў: «Фанфан-Тульпан», маст. фільм, 2003 г., Францыя.
**22.55** Аб'ектыў.

## 16 ЛЮТАГА, АЎТОРАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна».
**09.05** Дэтэктыўны серыял «Ліквідацыя».
**09.55** Меладрама «Сёстры па крыві».
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Адмысловы рэпартаж АТН «Прыкметны бізнэс».
**12.05** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Дзённік Алімпіяды.
**12.30** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Фігурнае катанне. Пары.
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Ток-шоў «Ход у адказ».
**16.25** Меладрама «Сёстры па крыві».
**17.25** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.25** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Дзённік Алімпіяды.
**18.50, 00.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтэрэсаў.
**19.55** Дэтэктыўны серыял «Ліквідацыя».
**21.00** Панарама.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Мілан - Манчэстэр Юнайтэд. Прамая трансляцыя.
**00.05** Дзень спорту.
**00.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд.

### ОНТ

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10, 00.45** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Чакай мяне.
**10.00** «Бацькі не па сваёй волі».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.25, 01.00** Навіны спорту.
**11.10** «Адзін супраць усіх».
**12.00** «Малахаў+».
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Віёла Тараканава. У міры злачыннай страсці». Шматсерыйны фільм.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.20** Серыял «Мая выдатная няня».
**19.00** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**21.05** Прэм'ера. «Крэм». Шматсер. фільм.
**22.05** «Вербная нядзеля». Шматсер. фільм.
**23.30** «Зваротны адлік». «Чырвоны аловак цэнзуры».
**00.00** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Мінштына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** Фільм «Грахі нашы». Украіна, 2007 г.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.45, 17.30** «Званая вячэра».
**12.40, 18.30** «Былая». Серыял.
**13.50** «Крокі да поспеху».
**14.40** «Элен і рабяты. Лепшыя серыі». Моладзевы серыял.
**15.35** «Top Gear. Руская версія».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Мінштына».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Аўтапанарама».
**20.55** «Галіна». Серыял. Закл. серыя.
**22.00** «Пяць гісторый».
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Надзвычайныя гісторыі».
**23.50** «Пантэра». Серыял.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.30** Дэтэктыў «Блакітны карбункул».
**11.50** Прэм'ера. Дак. фільм «Галерэя».
**12.40** «Запал па культуры».
**13.25** Кінаспробы.
**13.45** Мультсерыял «Сямейка піратаў».
**14.35** Пазакласная гадзіна.
**14.55** Свая кампанія.
**15.30** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ».
**16.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**19.40** Калыханка.
**19.55** Алімпійскія гульні. Ванкувер - 2010. Горналыжны спорт. Мужчыны. Біятлон. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**21.25** Дэтэктыў «Вяртанне рэзідэнта» (СССР). 2-я серыя.
**22.40** Алімпійскія гульні. Ванкувер - 2010. Біятлон. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**23.35** Алімпійскія гульні. Ванкувер - 2010. Хакей. ЗША - Швейцарыя.
**01.30** Алімпійскія гульні. Ванкувер - 2010. Горналыжны спорт. Мужчыны.
**02.35** Спорт-кадр.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Старыя рускія бабкі». Дак. фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.25** «Нічога асабістага».
**11.40** Тэлесерыял «Райскія яблычкі. Жыццё працягваецца».
**13.20** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.25** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**15.15** Тэлесерыял «Неадкладка».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.25** «Кулагін і партнёры».
**17.55** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.30** Тэлесерыял «Райскія яблычкі. Жыццё працягваецца».
**22.25** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**23.25** Навіны - Беларусь.
**23.35** «Весткі+».
**23.55** Прэм'ера. «Золата для партыі. Бабаўнянае справа». Дакументальны фільм.

### НТВ

**07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.35** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**09.05** «Следства вялі…».
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.55** «Кватэрнае пытанне».
**11.50** Дэтэктыўны серыял «МУР ёсць МУР».
**12.40, 18.20** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**13.30** Серыял «Тэрыторыя прыгажосці».
**15.10** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Мядзведжы кут».
**21.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Агент адмысловага прызначэння».
**23.40** Футбол. Ліга Чэмпіёнаў. Ліён (Францыя) - Рэал (Мадрыд).

### EUROSPORT

**04.00** Канькабежны спорт. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. 500 м.
**04.45** Фігурнае катанне. Зімовыя Алімпійскія гульні. Пары. Адвольная праграма.
**06.00** Санкавы спорт. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. Ванкувер (Канада).
**06.15** Фігурнае катанне. Зімовыя Алімпійскія гульні. Пары. Адвольная праграма.
**07.00** Сноўборд. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Сноубордкрос.
**07.30, 08.15, 09.15** Зімовыя Алімпійскія гульні. Навіны.
**07.40** Канькабежны спорт. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. 500 м.
**08.25** Лыжныя гонкі. Зімовыя Алімпійскія гульні. Індывідуальныя спаборніцтвы. 15 км.
**09.25** Фігурнае катанне. Зімовыя Алімпійскія гульні. Пары. Адвольная праграма.
**11.00** Лыжныя гонкі. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. 10 км.
**12.00** Лыжныя гонкі. Зімовыя Алімпійскія гульні. Індывідуальныя спаборніцтвы. 15 км.
**13.00, 16.00, 19.00** Зімовыя Алімпійскія гульні. Фінішная прамая. Часопіс.
**13.30** Фігурнае катанне. Зімовыя Алімпійскія гульні. Пары. Адвольная праграма.
**15.00** Лыжныя гонкі. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. 10 км.
**16.30** Лыжныя гонкі. Зімовыя Алімпійскія гульні. Індывідуальныя спаборніцтвы. 15 км.
**17.30** Фігурнае катанне. Зімовыя Алімпійскія гульні. Пары. Адвольная праграма.
**19.30** Зімовыя Алімпійскія гульні. Зваротны адлік. Часопіс.
**20.00** Горныя лыжы. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Хуткасны спуск/камбінацыя.
**20.30** Біятлон. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. Гонка пераследу.
**21.15** Горныя лыжы. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Хуткасны спуск/камбінацыя.
**21.30** Лыжныя гонкі. Зімовыя Алімпійскія гульні. Індывідуальныя спаборніцтвы. 15 км.
**22.15** Сноўборд. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. Сноубордкрос.
**22.45** Біятлон. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Гонка пераследу.
**23.30** Горныя лыжы. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Слалам/камбінацыя.
**00.30** Канькабежны спорт. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. 500 м.
**02.00** Санкавы спорт. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны.
**02.30** Фігурнае катанне. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Кароткая праграма.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.10** Праект "Будучыня".
**17.40, 19.30** Мультсерыял.
**17.50** «Музычныя партызаны», дак. фільм.
**18.45** Тыдзень з радыё «Свабода».
**19.25** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.40** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.45** «Па кім маўчыць звон?», дак. фільм.
**20.15** Акно ў Еўропу.
**20.45** Сальда (эканамічная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял.
**22.15** Форум: «Усе мы спажыўцы».
**22.55** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 17 ЛЮТАГА, СЕРАДА

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.05** Серыял «Ліквідацыя» (Расія).
**09.55** Меладрама «Сёстры па крыві».
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Адмысловы рэпартаж АТН «Таямнічы лес».
**12.05** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Дзённік Алімпіяды.
**12.30** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Фігурнае катанне. Мужчыны.
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** «У інтэрасах нацыянальнай бяспекі».
**16.05** Уласный персонал.
**16.30** Меладрама «Сёстры па крыві».
**17.30** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.25** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Дзённік Алімпіяды.
**18.50, 00.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.30** «КЕНО».
**19.40** «Зямельнае пытанне».
**20.00** Дэтэктыўны серыял «Ліквідацыя».
**21.00** Панарама.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Порту - Арсенал. Прамая трансляцыя.
**00.05** Дзень спорту.
**00.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд.

---

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10, 00.45** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер.фільм.
**10.00** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.25, 01.00** Навіны спорту.
**11.10** «Дэтэктывы».
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Віёла Тараканава. У міры злачынных страсцей». Шматсерыйны фільм.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.20** Серыял «Мая выдатная няня».
**19.00** «Слова жанчыне». Шматсер.фільм.
**20.00** Час.
**21.05** Прэм'ера. «Крэм». Шматсер. фільм.
**22.05** «Вербная нядзеля». Шматсер. фільм.
**23.30** «Дакументальны дэтэктыў».
**00.00** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40, 20.10** «СТБ-спорт».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Пантэра». Серыял.
**09.35** «Тэніс. Кубак Федэрацыі- 2010. Партугальскі вояж».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.45, 17.30** «Званая вячэра».
**12.40, 18.30** «Былая». Серыял.
**13.50** «Ваенная таямніца».
**14.40** «Элен і рабяты. Лепшыя серыі». Моладзевы серыял.
**15.35** «Галіна». Серыял. Заключная серыя.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Дабро пажаліцца».
**20.55** «Выкраданне багіні». Серыял.
**22.00** «Мінск і мінчане».
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**23.50** «Пантэра». Серыял. Закл. серыя.

---

**07.00** Алімпійскія гульні. Ванкувер - 2010. Хакей. Расія - Латвія. Прамая трансляцыя.
**09.30** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**10.00** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**11.00** У гэты дзень.
**11.05** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**12.05** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**12.45** Спорт-кадр.
**13.20** Мультсерыял «Сямейка піратаў».
**14.10** Пазакласная гадзіна.
**14.25** Лабірынты: Бенедыкт Дыбоўскі.
**14.55** Медычныя таямніцы.
**15.25** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ».
**16.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**19.45** «Калыханка».
**20.10** Алімпійскія гульні. Ванкувер - 2010. Лыжныя гонкі. Прамая трансляцыя.
**21.00** Алімпійскія гульні. Ванкувер - 2010. Горналыжны спорт. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**22.00** Алімпійскія гульні. Ванкувер - 2010. Хакей. Фінляндыя - Беларусь. Прамая трансляцыя.
**00.30** Алімпійскія гульні. Ванкувер - 2010. Лыжныя гонкі. Фіналы.

---

РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Алімпіскі спакой. Сакрэты бяспекі». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Райскія яблычкі. Жыццё працягваецца».
**13.20** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.25** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**15.15** Тэлесерыял «Неадкладка».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.25** «Кулагін і партнёры».
**17.55** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.30** Тэлесерыял «Райскія яблычкі. Жыццё працягваецца».
**22.25** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**23.25** Навіны - Беларусь.
**23.35** «Весткі+».
**23.55** «Здань чорнай смерці». Дак. фільм.

---

НТВ

**07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.30** «Выратавальнікі».
**09.00** «Вочная стаўка».
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.55** «Дачны адказ».
**11.50** Дэтэктыўны серыял «МУР ёсць МУР».
**12.40** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**13.30** Серыял «Тэрыторыя прыгажосці».
**15.10** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Мядзведжы кут».
**23.40** Футбол. Ліга Чэмпіёнаў. Баварыя (Германія) - Фіярэнціна (Італія).

---

EUROSPORT

**04.00** Фігурнае катанне. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Кароткая праграма.
**06.45** Хакей на лёдзе. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Групавы этап. Расія - Латвія.
**07.30, 08.15, 09.15** Зімовыя Алімпійскія гульні. Навіны.
**07.40** Хакей на лёдзе. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Групавы этап. Расія - Латвія.
**08.25** Хакей на лёдзе. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Групавы этап. Расія - Латвія.
**09.25** Фігурнае катанне. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Кароткая праграма.
**11.00** Біятлон. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. Гонка пераследу.
**11.30** Біятлон. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Гонка пераследу.
**12.00** Горныя лыжы. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Слалам/камбінацыя.
**13.00** Зімовыя Алімпійскія гульні. Фінішная прамая. Часопіс.
**13.30** Біятлон. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. Гонка пераследу.
**14.00** Біятлон. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Гонка пераследу.
**14.45** Горныя лыжы. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Слалам/камбінацыя.
**16.00** Зімовыя Алімпійскія гульні. Фінішная прамая. Часопіс.
**16.30** Біятлон. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. Гонка пераследу.
**17.00** Біятлон. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Гонка пераследу.
**17.30** Фігурнае катанне. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Кароткая праграма.
**18.50** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.00** Зімовыя Алімпійскія гульні. Фінішная прамая. Часопіс.
**19.30** Зімовыя Алімпійскія гульні. Зваротны адлік. Часопіс.
**20.00** Лыжныя гонкі. Зімовыя Алімпійскія гульні. Спрынт. Кваліфікацыя. Мужчыны/жанчыны. Ванкувер (Канада).
**21.00** Горныя лыжы. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. Хуткасны спуск.
**22.30** Лыжныя гонкі. Зімовыя Алімпійскія гульні. Спрынт. Мужчыны/жанчыны.
**00.00** Фігурнае катанне. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Кароткая праграма.
**01.30** Горныя лыжы. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. Хуткасны спуск. Ванкувер (Канада).
**02.00** Канькабежны спорт. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. 1000 м. Ванкувер (Канада).
**03.30** Шортаў-трэк. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. 500 м.

---

БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.10** На колах.
**17.40** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял.
**18.35** Чалавек і вайна: «1945. год, які змяніў свет», дак. фільм, 2005 г., Вялікабрытанія: 3 серыя.
**19.25** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.40** «Кіпіць Няміга», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**20.15** Маю правa (прававаяпраграма).
**20.30** Без рэтушы: «Беларускае золата», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Вы не пакінеце мяне», маст. фільм, 2006 г., Расія.
**23.10** Аб'ектыў.

## 18 ЛЮТАГА, ЧАЦВЕР

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.05** Серыял «Ліквідацыя» (Расія).
**10.00** Меладрама «Сёстры па крыві».
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Відэафільм АТН «Капыль. Аповесць даўніх шляхоў» цыклу «Зямля беларуская».
**12.05, 18.25** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Дзённік Алімпіяды.
**12.30** Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010. Канькабежны спорт. Мужчыны.
**13.45** Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010. Сноўборд. Мужчыны.
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Сямейная сага «Ярмолавы» (Расія).
**16.25** Меладрама «Сёстры па крыві».
**17.30** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 00.45** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Біятлон. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**22.00** Панарама.
**22.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.55** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Біятлон. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**00.50** Дзень спорту.

---

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10, 01.10** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.25, 01.25** Навіны спорту.
**11.10** «Дэтэктывы».
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Віёла Тараканава. У міры злачынных страсцей». Шматсерыйны фільм.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.20** «Мая выдатная няня». 2004.
**19.00** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**21.05** Прэм'ера. «Крэм». Шматсер. фільм.
**22.05** «Вербная нядзеля». Шматсер.фільм.
**23.30** «Эмігранты. Шлях дадому».
**00.25** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Дабро пажаліцца».
**08.50** «Пантэра». Серыял. Закл. серыя.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.45** «Званая вячэра».
**12.40** «Былая». Серыял.
**13.50** «Надзвычайныя гісторыі».
**14.40** «Элен і рабяты. Лепшыя серыі». Моладзевы серыял.
**15.35** «Выкраданне багіні». Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Аўтапанарама».
**20.55** «Выкраданне багіні». Серыял.
**22.00** «Асабісты інтэрас».
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Сакрэтныя гісторыі».
**23.50** «Інструктар». Серыял.

---

**07.00** Алімпійскія гульні. Ванкувер - 2010. Хакей. Чэхія - Славакія. Прамая трансляцыя.
**09.30** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**10.00** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**11.00** У гэты дзень.
**11.05** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**12.00** Экспедыцыя.
**12.25** Бітва экстрасэнсаў.
**13.30** «Рыска…пункцір…». Дак. фільм.
**14.10** Мультсерыял «Сямейка піратаў».
**14.20** Пазакласная гадзіна.
**14.50** Жывы гук.
**15.35** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ».
**16.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**19.40** Калыханка.
**19.55** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Рубін (Казань) - Апоэль (Тэль - Авіў). Прамая трансляцыя.
**22.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Фулхэм - Шахцёр (Данецк). Прамая трансляцыя.
**00.00** Алімпійскія гульні. Ванкувер - 2010. Хакей. ЗША - Нарвегія.

---

РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Вялікі і жудасны Жук». Дак. фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Райскія яблычкі. Жыццё працягваецца».
**13.15** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.25** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**15.15** Тэлесерыял «Неадкладка».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.25** «Кулагін і партнёры».
**17.55** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.30** Тэлесерыял «Райскія яблычкі. Жыццё працягваецца».
**22.25** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**23.25** Навіны - Беларусь.
**23.35** «Весткі+».
**23.55** «Песні пакалення. Юры Антонаў». Дакументальны фільм.

---

НТВ

**07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Сёння.
**07.05** ІКанал «Сёння раніцай».
**08.30** «Жаночы погляд».
**09.10** «І зноў добры дзень!».
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.50** «Крамлёўская кухня».
**11.40** Дэтэктыўны серыял «МУР ёсць МУР».
**12.30** «Першая кроў».
**13.30** Серыял «Тэрыторыя прыгажосці».
**15.10** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.20** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.45** Серыял «Мядзведжы кут».
**20.45** Драматычны трылер «Выкуп».
**22.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**23.00** Сёння.
**23.25** «Галоўны герой прадстаўляе…».
**00.10** «Фатальны дзень».

---

EUROSPORT

**04.00** Шорт-трэк. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. 500 м. Ванкувер (Канада).
**05.15** Сноўборд. Зімовыя Алімпійскія гульні. Хафпайп. Ванкувер (Канада).
**06.15** Санкавы спорт. Зімовыя Алімпійскія гульні. Двойкі. Ванкувер (Канада).
**07.00** Хакей на лёдзе. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Групавы этап. Чэхія - Славакія. Ванкувер (Канада).
**07.30, 08.15, 09.15** Зімовыя Алімпійскія гульні. Навіны.
**07.40** Хакей на лёдзе. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Групавы этап. Чэхія - Славакія. Ванкувер (Канада).
**08.25** Хакей на лёдзе. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Групавы этап. Чэхія - Славакія. Ванкувер (Канада).
**09.25** Горныя лыжы. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. Хуткасны спуск.
**11.00** Хакей на лёдзе. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Групавы этап. Чэхія - Славакія. Ванкувер (Канада).
**12.00** Лыжныя гонкі. Зімовыя Алімпійскія гульні. Спрынт. Мужчыны/жанчыны.
**13.00** Зімовыя Алімпійскія гульні. Фінішная прамая. Часопіс.
**13.30** Канькабежны спорт. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. 1000 м.
**14.00** Горныя лыжы. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. Хуткасны спуск. Ванкувер (Канада).
**15.00** Лыжныя гонкі. Зімовыя Алімпійскія гульні. Спрынт. Мужчыны/жанчыны. Ванкувер (Канада).
**16.00** Зімовыя Алімпійскія гульні. Фінішная прамая. Часопіс.
**16.30** Канькабежны спорт. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. 1000 м. Ванкувер (Канада).
**17.00** Горныя лыжы. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. Хуткасны спуск. Ванкувер (Канада).
**18.00** Лыжныя гонкі. Зімовыя Алімпійскія гульні. Спрынт. Мужчыны/жанчыны. Ванкувер (Канада).
**18.50** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.00** Зімовыя Алімпійскія гульні. Фінішная прамая. Часопіс.
**19.30** Зімовыя Алімпійскія гульні. Зваротны адлік. Часопіс.
**20.00** Біятлон. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. 15 км. Ванкувер (Канада).
**21.45** Лыжныя гонкі. Зімовыя Алімпійскія гульні. Спрынт. Мужчыны/жанчыны.
**23.00** Біятлон. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. 20 км. Ванкувер (Канада).
**00.45** Канькабежны спорт. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. 1000 м.
**01.45** Біятлон. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. 15 км. Ванкувер (Канада).
**02.45** Сноўборд. Зімовыя Алімпійскія гульні. Хафпайп. Ванкувер (Канада).
**03.00** Фігурнае катанне. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Адвольная праграма. Ванкувер (Канада).

---

БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17. 10** Праект «Будучыня».
**17.40** «Ветравей», маст. фільм, 1977 г., Аўстралія.
**19.10** Сальда (эканамічная праграма).
**19.25** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.40** Мая калекцыя.
**20.00** Ігар Колб – варыяцыі прынца.
**20.15** Форум: «Сантэхніка выклікалі?»
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Афіцэры», дэтэктыўны серыял.
**22.10** Без рэтушы: «Беларускае золата», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**22.40** Аб'ектыў.

## 21 ЛЮТАГА, НЯДЗЕЛЯ

### 1

**07.50** Фільм-казка «На залатым ганку сядзелі…» (СССР).
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.05** «Арсенал».
**09.35** «Зброя». Цыкл дак. фільмаў (Беларусь).
**09.50** Альманах вандраванняў.
**10.20** Культурныя людзі.
**10.55** У свеце матораў.
**11.30** Nota Bene.
**12.05** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Дзённік Алімпіяды.
**12.30** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Канькабежны спорт. Мужчыны.
**13.10** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Хакей. Мужчыны. Латвія - Славакія.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Відэафільм АТН «Сузор'е цырку».
**15.55** Меладрама «Ванечка» (Расія).
**18.00** Суперлато.
**19.10** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**19.40** Дак. цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.55** «КЕНО».
**21.00** «У цэнтры ўвагі».
**22.00** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Хакей. Расія - Чэхія. Прамая трансляцыя.

### Н

**07.00** «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00, 16.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Серыял «Хто ў хаце гаспадар?».
**09.55** Нядзельны «Ералаш».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.05** Фазэнда.
**11.40** «Ранішняя пошта».
**12.15** «Разумніцы і разумнікі».
**13.00** «Песні Перамогі». «Колькі каштуе музыка».
**13.30** Анімацыйны фільм «Ліло і Сціч».
**15.00** Прэм'ера. «Анастасія. Анёл рускай эскадры».
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Ганна Самохіна, Валянцін Гафт у фільме «Злодзеі ў законе».
**18.10** Камедыя «Мадам Ірма».
**20.00** Контуры.
**21.05** «Дыханне планеты».
**21.40** Меладрама «Анёл».
**00.05** «Пражэктарперісхілтан».

### ТВ

**07.15** «Агенцтва 2». Камедыйны серыял.
**08.05** Фільм «Прачнуўшыся ў Рына». ЗША.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.55** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Добры дзень, доктар!».
**13.45** «Дарагая перадача».
**13.55** Фільм «Не бойся, я з табой!». СССР.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень».
**20.40** Фільм «Выгляд зверху лепш». ЗША.
**22.20** «Прафесійны бокс».
**23.15** Фільм «Інтэрв'ю». ЗША, 2007 г.
**00.40** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### лад

**07.00** Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010. Хакей. Германія - Беларусь. Прамая трансляцыя.
**09.30** Дабравест.
**09.55** Мір вашай хаце.
**10.10** Школа рамонту.
**11.10** Медычныя таямніцы.
**11.55** Кінаспробы.
**12.15** Бухта капітанаў.
**12.55** «Правы чалавека».
**13.10** Вострасюжэтны серыял «Афіцэры» (Расія). 5–8, заключная, серыі.
**16.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Манчэстэр Сіці - Ліверпуль. Прамая трансляцыя.
**18.55** «Зоркі гумару». Гумарыстычная праграма (Расія).
**19.20** Экспедыцыя.
**20.20** Тэлебарометр.
**20.40** Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010. Біятлон. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**21.35** Свая музыка. Працяг.
**22.10** Жывы гук.
**22.55** Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010. Біятлон. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**23.55** Алімпійскія гульні. Ванкувер - 2010. Горналыжны спорт. Мужчыны. Прамая трансляцыя.

### РОССИЯ

**07.00** «Уся Расія».
**07.30** Камедыя «Прывітанне і бывай».
**09.10** Фільм «Тэрапія каханнем». 2009 г.
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.30** Фільм «Увага! Усім пастам...».
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.45** «Гарадок». Дайджэст.
**15.15** Камедыя «Іван Броўкін на цаліне».
**17.00** «Аншлаг» на Поўначы».
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** «Сумленны дэтэктыў».
**20.40** «Танцы з Зоркамі». Сезон - 2010.
**23.00** Вострасюжэтны фільм «Помста». 2007 г.
**00.45** «Аляксандра Пахмутава. Абранае».

### НТВ

**05.55** Камедыйны баявік «Гарадскі паляўнічы».
**07.30** Мультфільм.
**08.00, 10.00, 13.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.50** «Іх норавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.50** «Асабліва небяспечны!».
**11.25** «Першая кроў».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.20** «Крамлёўская кухня».
**14.10** Меладрама «Паміж мінулым і будучыняй».
**16.00** Сёння.
**16.25** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**17.20** «І зноў добры дзень!».
**18.20** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**19.55** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.25** Дэтэктыўны серыял «Следапыт».
**00.05** «Авіятары».

### EUROSPORT

**04.00** Шорт-трэк. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. 1000 м. Ванкувер (Канада).
**04.15** Бабслей. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Двойкі. Ванкувер (Канада).
**04.30** Шорт-трэк. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. 1000 м. Ванкувер (Канада).
**05.00** Шорт-трэк. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. 1500 м. Ванкувер (Канада).
**06.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Зімовыя Алімпійскія гульні. HS 140. Ванкувер (Канада).
**07.00** Хакей на лёдзе. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Групавы этап. Германія - Беларусь. Ванкувер (Канада).
**07.30** Зімовыя Алімпійскія гульні. Навіны.
**07.40** Хакей на лёдзе. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Групавы этап. Германія - Беларусь. Ванкувер (Канада).
**08.15** Зімовыя Алімпійскія гульні. Навіны.
**08.25** Хакей на лёдзе. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Групавы этап. Германія - Беларусь. Ванкувер (Канада).
**09.15** Зімовыя Алімпійскія гульні. Навіны.
**09.25** Скачкі на лыжах з трампліна. Зімовыя Алімпійскія гульні. HS 140. Ванкувер (Канада).
**11.00** Горныя лыжы. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. Супер-гігант. Ванкувер (Канада).
**12.00** Лыжныя гонкі. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. 15 км. Гонка праследу. Ванкувер (Канада).
**13.00** Зімовыя Алімпійскія гульні. Фінішная прамая. Часопіс.
**13.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Зімовыя Алімпійскія гульні. HS 140. Ванкувер (Канада).
**14.15** Горныя лыжы. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. Супер-гігант. Ванкувер (Канада).
**15.00** Лыжныя гонкі. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. 15 км. Гонка праследу. Ванкувер (Канада).
**16.00** Зімовыя Алімпійскія гульні. Фінішная прамая. Часопіс.
**16.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Зімовыя Алімпійскія гульні. HS 140. Ванкувер (Канада).
**17.15** Горныя лыжы. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. Супер-гігант. Ванкувер (Канада).
**18.00** Лыжныя гонкі. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. 15 км. Гонка праследу. Ванкувер (Канада).
**19.00** Зімовыя Алімпійскія гульні. Фінішная прамая. Часопіс.
**19.30** Зімовыя Алімпійскія гульні. Зваротны адлік. Часопіс.
**20.00** Горныя лыжы. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Слалам-гігант. Спроба 1. Ванкувер (Канада).
**20.45** Біятлон. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. 15 км. Мас-старт. Ванкувер (Канада).
**21.30** Лыжныя гонкі. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. 15 км. Гонка праследу. Ванкувер (Канада).
**23.00** Біятлон. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны.12,5 км. Мас-старт. Ванкувер (Канада).
**23.45** Горныя лыжы. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Слалам-гігант. Спроба 2. Ванкувер (Канада).
**00.45** Бабслей. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Двойкі. Ванкувер (Канада).
**01.45** Канькабежны спорт. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. 1500 м. Ванкувер (Канада).
**02.30** Фігурнае катанне. Зімовыя Алімпійскія гульні. Арыгінальны танец. Ванкувер (Канада).
**03.30** Фрыстайл. Зімовыя Алімпійскія гульні. Сноубордкрос. Фінал. Ванкувер (Канада).
**03.45** Фігурнае катанне. Зімовыя Алімпійскія гульні. Арыгінальны танец. Ванкувер (Канада).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.30** Дак. гадзіна: «Паветраная абарона падчас «халоднай вайны», дак. фільм, Германія.
**19.25** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.40** «Манастыр», дак. фільм, Польшча.
**20.05** МакраФон: канцэрт гурта «Троіца», ч. 1.
**20.30** Акно ў Еўропу.
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня).
**21.30** Фільматэка майстроў: «Патаемнае», маст. фільм, 2005 г., Францыя–Аўстрыя–Германія–Італія.

# Шаноўныя чытачы!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску. Падпісацца можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012211080010 фил. МГД ОАО «Белинвестбанк», код 153001764, УНН 190790926
г. Минск, ул. Коллекторная, 11

КУДА ______
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ______
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ______

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______
Время приема ______ ч. ______ мин.
Подпись

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у аддзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)

Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня ______

Кассир Всего ______

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

Новы час

www.novychas.org

ЦІКАВА

# ФЮРЭР ІДЗЕ НА КАРНАВАЛ

Іван БІЧ

**Па ўсяму свету пачынаецца сезон карнавалаў — перыяд павальнага вяселля. Між тым, у часы нацысцкай дыктатуры ў Германіі карнавалы былі таксама важным сродкамі дзяржаўнай прапаганды.**





На мінулым тыдні ў Германіі адбылася прэзентацыі кнігі, прысвечанай гісторыі карнавалаў у нацысцкай Германіі. Яе напісалі гісторыкі Карл Дзітмар і Маркус Ляйфельд. Абодва, дарэчы, з Кёльну, які даўно носіць тытул сталіцы нямецкіх карнавалаў.

Увогуле, практыка святкавання карнавалаў з'явілася яшчэ ў паганскія часы і была ўпісана ў цыкл палявых прац. Нягледзячы на намаганні царкоўных аўтарытэтаў, карнавальная традыцыя засталася ў Германіі і пасля прыходу хрысціянства. У пачатку XIX стагоддзя правядзенне карнавалаў было рэгламентавана. Асноўныя блокі праграмы карнавалу ўключалі ў сябе рытуалы адкрыцця, абрання караля свята, вулічныя танцы, дэфіле гіганцкіх пудзілаў і, нарэшце, сцэнічныя выступы артыстаў. Карнавалы карысталіся вялікай папулярнасцю. Паступова яны ператварыліся ў сапраўдны бізнес. Кожная большменш паважная фірма выстаўляла сваю сцэну або фінансавала вырабленне пудзілаў. Былі створаныя адпаведныя карпарацыі арганізатараў і акцёраў.

У тым жа XIX стагоддзі арганізатары карнавалаў сталі браць пад увагу палітычны фактар. Палітыка часта ўносіла свае карэктывы ў графік правядзення святочных мерапрыемстваў. У 1861 годзе менавіта напярэдадні карнавалу памер кароль Фрыдрых Вільгельм IV. Гэта стала падставай для адмены карнавалаў у гарадах Паўночнай Германіі. Карнавалы былі забароненыя і ўвосень 1870 года: у гэты час ішла вайна з Францыяй. Вялікая дэпрэсія і палітычная нестабільнасць у Веймарскай рэспубліцы прымусілі на пачатку 1930-х гадоў многія нямецкія гарады адмовіцца ад традыцыйнага святкавання.

Яшчэ больш свята было палітызаванае пасля таго, як канцлерам краіны стаў Адольф Гітлер. Па-першае, фестывалі павінны былі сімвалічна нагадваць пра вяртання да добрых часоў, якія ідуць на змену цяжкаму перыяду эканамічнага крызісу і рэспубліканскай анархіі. Па-другое, фестывалі сталі тым, што паказвалі турыстам.

Акрамя таго, афіцыйныя прапагандысты бачылі ў карнавальных святах праяву арыйскай традыцыі і народнага адзінства. У канцэпцыях культурнай палітыкі Трэцяга рэйху карнавалам адводзілася важнае месца «аддзелу афіцыйнага гумару». Была нават прыдумана версія змовы: нібыта габрэйскія літаратары і іх найміты, якія раней складалі сцэнары правядзення карнавалаў у часы Веймарскай рэспублікі, ставілі перад сабой мэту — давесці публіку да такога стану, каб мерапрыемства абавязкова перайшло ў фінале ў калектыўную оргію. Пры гэтым, як пісаў тады Томас Ліссэм, адзін з нацысцкіх знаўцаў карнавалаў: «Усё народнае, усё, што звязана з традыцыямі, свядома адкідвалася».

У 1937 годзе ўсе артысты, якія займаліся карнаваламі, былі вымушаныя стаць сябрамі «Саюзу нямецкіх карнавальшчыкаў». Раней, пачынаючы з 1934 года, штогод напярэдадні карнавальных шэсцяў арганізатары пачалі атрымліваць спецыяльныя кніжкі рэкамендаваных да спеваў песняў. Добрую частку з іх складалі тэксты пра габрэяў, якія ў той час з-за палітыкі дыскрымінацыі былі вымушаны масава эміграваць з краіны. Нацысты лічылі, што гэты сыход габрэяў — добрая тэма для гумарыстаў. «Ура, ура! Габрэі бягуць!» — гучаў рэфрэн адной з песняў, прапанаваных для абавязковага выканання на свяце. У той жа час на карнавальных парадах з'явіліся вялікія пудзілы, якія знешне нагадвалі артадаксальных габрэяў. Звычайна на іх пісалі: «Апошні сыходзіць».

За два гады да стварэння «Саюза нямецкіх карнавальшчыкаў» склад аб'яднанняў карнавальшчыкаў зачысцілі ад асоб габрэйскага паходжання. Гэта называлася «арыйскі параграф».

Дасталася і артыстам, якія igралі на сцэнах персанажаў процілеглага полу. Адказныя за карнавалы пабачылі ў гэтым прапаганду гомасексуалізму. У 1937 годзе нумары з элементамі транссексуалізму былі абвешчаны па-за законам.

Ачысціўшы карпарацыі карнавальшчыкаў ад габрэяў і «вычварэнцаў», нацысты ўзяліся за фармат мерапрыемстваў. Камусьці ў галаву прыйшла ідэя правесці адзіны дзяржаўны карнавал. У «конкурсе» перамог карнавал Кёльну. Задачу даверылі функцыянерам дзяржаўнай праграмы для моладзі «Радасць праз сілу». Менавіта сяброў «Радасці праз сілу» штогод звазілі з усёй імперыі ў Кёльн на свята. Застаецца дадаць, што ахвярай такой практыкі стаў мясцовы каларыт фестывалю і рэпертуар акцёраў. Паколькі мерапрыемства было ўпісанае ў каляндар афіцыйных дат, жартаваць было дазволена на тэмы, узгодненыя ў апараце Нацыянал-сацыялістычнай рабочай партыі.

Цікава, што спачатку адказныя за рэпертуар карнавалаў дазвалялі камедыянтам высмейваць некаторыя недарэчнасці сістэмы — напрыклад, дэфіцыт прадуктаў. Аднак хутка такія жарты таксама забаранілі.

Аўтары кнігі вымушаныя былі прызнаць, што ў сваёй абсалютнай большасці акцёры і арганізатары карнавалаў пагаджаліся на патрабаванні нацыстаў: кпілі з габрэяў і палітычнай апазіцыі, выкрэслівалі са сваіх выступаў і тэкстаў інтэрмедый хоць нейкую крытыку існуючай сістэмы. Больш таго, часам некаторыя аргкамітэты карнавалаў самі выступалі ініцыятарамі нацыфікацыі святаў. Напрыклад, прапаноўвалі шэсці супраць імпартных прадуктаў, за тое, каб немцы набывалі «нямецкае». Аўтары кнігі спрабуюць растлумачыць гэта мясцовым патрыятызмам. Для гарадскога бюджэту карнавалы былі вельмі важнай крыніцай. Як следства — апартунізм. Лепш хоць нейкі карнавал, чым ніякі.

Аднак нельга казаць пра тое, што гумарысты проста так здаліся. У кніжцы згадваюцца як мінімум два выпадкі, калі карнавальшчыкі спрабавалі пратэставаць. Так, кёльнскі комік Карл Купер зрабіў пародыю на нацысцкае прывітанне «Зіг хайль!». Ён падчас выступу падняў руку, быццам аддае нацысцкае прывітанне. Потым перавярнуў далонь і спытаў у аўдыторыі: «Вам не здаецца, што ідзе дождж?» Выхадка каштавала яму абвінавачвання паводле артыкулу «Здзек з фашысцкага прывітання» (быў такі пункт у Крымінальным кодэксе тагачаснай Германіі). Суд прысудзіў яго да пажыццёвай забароны на публічныя выступы.

Леа Штац, прэзідэнт Саюза карнавальшчыкаў Дзюсельдорфа, увогуле расплаціўся за пратэсты жыццём. У 1943 годзе ён заявіў, што не верыць у канчатковую перамогу нацызму. За гэта Леа прыгаварылі да смяротнага пакарання. Думаецца, што ўчынак Штаца быў цалкам матываваны. З 1939 года ўсе карнавалы ў Германіі забаранілі з-за вайны, і Леа меў усе падставы ненавідзіць вайну і Гітлера.



## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Сапраўдныя механізмы адносін Захаду з постсавецкімі краінамі можна добра праілюстраваць на прыкладзе Беларусі: як толькі Лукашэнка пасварыўся з Пуціным, Брусель стаў праводзіць у адносінах да Мінска курс «змены праз супрацоўніцтва». Супярэчная пазіцыя, паколькі Лукашэнка, мяркуючы па ўсім, трымаецца за ўладу ўсё гэтак жа моцна. Такімі тэмпамі Лукашэнка стане новым улюбёнцам Захаду замест Саакашвілі.

**«The Guardian» (Вялікабрытанія)**

Прэзідэнт раздаў інструкцыі ўсім — ад на ведвальнікаў інтэрнэт-кавярняў да вебмайстроў... Усё б добра, толькі Рэспубліцы Беларусь дамен .by не належыць… Права адміністраваць і ўсталёўваць правілы рэгістрацыі даменаў Апаратыўна-аналітычны цэнтр (ААЦ) пры прэзідэнце Рэспублікі Беларусь атрымаў ад міжнароднай некамерцыйнай арганізацыі IANA, якая створана пры ўдзеле ўраду ЗША. Як ні намагаліся раней «прагрэсіўныя» Лівія, Іран, Паўночная Карэя, Куба і іншыя змяніць праз ААН такое становішча рэчаў, пакуль інтэрнэт знаходзіцца — і дзякуй Богу — пад кіраваннем амерыканскага ўраду… Пры жаданні, любы можа, заручыўшыся падтрымкай і экспертызамі міжнародных праваабарончых арганізацый, падаць скаргу, патрабуючы пазбавіць ААЦ адміністрацыйных паўнамоцтваў. А нагодаў для гэтага шмат: падазроныя тэхнічныя збоі DNS падчас прэзідэнцкіх выбараў 2001 года, шматлікія адмовы пры рэгістрацыі даменаў без тлумачэння прычынаў, скупка самых «смачных» даменаў самім адміністратарам.

**Electroname.com (Расія)**

На рускамоўных веб-сайтах з'явіліся паведамленні, у якіх падкрэсліваецца, што ў апошні час з вуснаў расійскіх палітыкаў усё часцей гучаць заявы пра магчымасць увядзення расійскіх войскаў на тэрыторыю Беларусі «ў выпадку пагрозы рэжыму Лукашэнкі». Улічваючы апошнія прававыя механізмы і «метады» Масквы пры дасягненні сваіх інтарэсаў, нядаўнія вучэнні «Захад–2009» ацэньваюцца як «рэпетыцыя акупацыі» гэтай краіны.

**«Georgia online» (Грузія)**

Пытанне пра рэальныя стратэгічныя намеры беларускага кіраўніцтва, на мой погляд, цяпер актуальна не толькі для Расіі, але і для самой Беларусі. Ствараецца ўражанне, што Мінск не цалкам разумее, у якую гульню і з якімі канчатковымі мэтамі ён уступае, пачаўшы так званую «шматвектарную» палітыку. Як далёка ён гатовы зайсці ў падобнай практыцы? Гэта неразуменне досыць відавочнае і ўжо мае вынік у выглядзе распаўсюду няўпэўненасці ў замежным палітычным курсе Беларусі. Магчыма, такая пазіцыя тэарэтычна пашырае поле для манеўру. Але ў практычным вымярэнні яна выклікае рызыкі. Сітуацыя тут складаецца парадаксальная. З аднаго боку, неразуменне і асабісты канфлікт паміж Лукашэнкам і расійскім урадам з кожным годам штурхае беларускае кіраўніцтва на збліжэнне з Захадам і яго постсавецкімі саюзнікамі (што аўтаматычна ўскладняе адносіны з Масквой). З іншага — чым шчыльней адносіны Лукашэнкі з Захадам, тым вастрэй будзе ставіцца пытанне пра яго адхіленне ад улады і пра радыкальную змену палітычнай і эканамічнай сістэмы ў Беларусі. Прычым варыянт перадачы ўлады кантраляванаму пераемніку гэтай праблемы цалкам не вырашыць.

**Цэнтр палітычных тэхналогій (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ФРАНЦЫЯ. БЫЦЬ ФРАНЦУЗАМ — ЗНАЧЫЦЬ ШАНАВАЦЬ СЦЯГ



Дзіўныя вынікі прынесла кампанія французскага ўрада, якая павінна была высветліць крытэрыі цяперашняй нацыянальнай ідэнтычнасці французаў. З гэтай мэтай з восені ў краіне праходзілі грамадскія дэбаты. Адпаведнаму міністэрству было даручана сабраць і прааналізаваць іх змест, каб пасля вывесці формулу французскага грамадзяніна. Сама ідэя наконт выяўлення ідэнтычнасці здавалася шмат каму вельмі супярэчлівай. Многія палітыкі крытыкавалі яе і называлі піярным крокам адміністрацыі Сарказі напярэдадні рэгіянальных выбараў. Раскрутка нацыянальнага пытання гарантавала галістам галасы ўсіх, каму не падабаюцца імігранты. Аднак яшчэ больш супярэчлівымі аказаліся вынікі дэбатаў. Падсумаваўшы іх, урад заявіў, што пытанне пра тое, вы француз ці не, трэба ставіць у плоскасці, ці падабаецца вам французскі сцяг? Цяпер трыкалор будзе вісець у кожным класе, а вучні атрымаюць брашуру пра яго гісторыю і значэнне. Такі падыход адразу выклікаў калі не смех, то абвінавачанні ў фармалізме кампаніі. Нават у апараце партыі Сарказі кажуць, што гіпербалізацыя ролі сцяга ў нацыянальнай свядомасці — гэта не вельмі нармальна. Аднак казаць пра правал або поспех кампаніі пакуль рана. Трэба дачакацца вынікаў сакавіцкіх выбараў у рэгіянальныя органы ўлады.

**Па матэрыялах «Le Monde» (Францыя)**

### ГЕРМАНІЯ. НАЦЫЯНАЛІСТЫЧНЫЯ CD

Федэральная камісія па пытаннях шкодных для юнакоў медыйных прадуктаў (ёсць і такая ў ФРГ) палічыла антызаконнымі ўчынкі паліцыі зямлі Ніжняя Саксонія. Паліцэйскія забаранілі актывістам праварадыкальнай Нацыянальнай дэмакратычнай партыі (NPD) раздаваць каля школ дыскі з запісамі музыкаў, якія прапагандуюць нацыяналістычныя ідэі. Такія раздачы адбываюцца ў рамках кампаніі «Акцыя: школьны двор», якую неанацысты праводзяць з 2004 года. Толькі ў мінулым годзе яны раздалі 50 тысяч дыскаў. Сябры камісіі забаранілі паліцыі па сваёй ініцыятыве замінаць распаўсюду патрыятычных CD. Тое, што дыскі ўтрымліваюць палітычную рэкламу партыі, не з'яўляецца падставай для забароны іх раздачы. Паліцэйскія могуць умешвацца выключна па патрабаванню кіраўніцтва школаў, калі там, у сваю чаргу, палічаць запісы небяспечнымі для адукацыйнага працэсу. Як паказвае практыка ў зямлі Брандэнбург, звычайна школьная адміністрацыя пры з'яўленні каля падпарадкаванага ёй ведамства агітатараў з NPD так і робіць.

**Па матэрыялах «Tageszeitung» (Германія)**

### УКРАІНА. ЮШЧАНКА ХОЧА ПЯРСЦЁНАК МАЗЕПЫ





Віктар Ючшанка, які хутка пакідае пасаду прэзідэнта Украіны, працягвае здзіўляць сваімі ўчынкамі. Ён масава ўзнагароджвае чыноўнікаў медалямі і ардэнамі. А зараз Ючшанка марыць стаць уладальнікам пярсцёнка Мазепы. Мацеца на ўвазе пярсцёнак, які ў 1932 годзе ўрад Украінскай Народнай Рэспублікі ў эміграцыі падараваў львоўскаму пісьменніку Богдану Лепкаму за напісанне трылогіі «Мазепа». Нягледзячы на тое, што ніякай гістарычнай каштоўнасці пярсцёнак не мае (яго і зрабілі ў тым жа 1932 годзе), Лепкі вельмі даражыў ім. Справа ў тым, што УНР патрабавала ад пісьменніка, каб ён перад смерцю перадаў той пярсцёнак асобе, якую ён лічыць самым вялікім патрыётам Украіны. Сам Лепкі, праўда, не паспеў распарадзіцца пярсцёнкам: яго канфіскавалі савецкія ўлады ў 1939 годзе. У 1996 годзе нацыяналісты зрабілі копію пярсцёнка і аднавілі традыцыю. Першым яго ўладальнікам стаў заснавальнік Украінскага народнага руху пісьменнік Іван Грач. Па логіцы, ён мусіў насіць яго да смерці. Аднак зараз ва ўкраінскай прэсе пачалася кампанія за тое, каб перадаць пярсцёнак Віктару Ючшанку як асобе, якая «заклала фундамент нацыянальна-дэмакратычнай дзяржавы еўрапейскай мадэлі». Ужо з'явіўся адкрыты ліст да Грача, падпісаны многімі вядомымі асобамі. Але Грач, між тым, адмовіўся аддаваць пярсцёнак.

**Па матэрыялах «Україна молода» (Украіна)**

ПРАЕКТ

# МЕСЯЧНЫЯ АМБІЦЫІ

*Алег ПЯТРОЎ*

**Наступным чалавекам, які прагуляецца па Месяцы, будзе індус або кітаец. Так сцвярджаюць эксперты пасля таго, як 1 лютага, прадстаўляючы ў Кангрэсе бюджэтны план на гэты год, Барак Абама адмовіўся ад амерыканкай Месячнай праграмы.**

Матывы адміністрацыі Абамы, каб замаразіць распрацаваны ў NASA Месячны праект (Constellation), зразумелыя. На дварэ крызіс, і лепш інвеставаць грошы ў праграмы, якія здольныя прынесці ў кароткія тэрміны гарантаваныя прыбыткі. Заакіянская прэса і нават рэспубліканская апазіцыя не вельмі перажываюць з таго факту, што краіна — лідэр даследаванняў Месяца, добраахвотна замарожвае Constellation.

Аднак вольнае месца пустым не бывае. Не паспелі амерыканцы адкласці свой праект, як у прэсе пачаліся спекуляцыі наконт пачатку бітвы за Месяц паміж Дэлі і Пекінам. Менавіта Індыя і Кітай пасля падзей 1 лютага атрымалі унікальны шанец запусціць на Месяц наступную экспедыцыю. Нагадаем, што дасюль толькі грамадзяне ЗША краналіся месячнага грунту. Гэта было ў далёкім 1972 годзе.

Прычым каласальныя выдаткі, якія патрэбныя на дэсант чалавека на Месяц, лідэраў згаданых краін не пужаюць. Стаўка вельмі высокая. Дзяржава-пераможца ў вайне за Месяц атрымае нешта большае за ўзоры грунту для лабараторных аналізаў. Сітуацыя падобная на часы «халоднай вайны», калі СССР і ЗША ўважліва сачылі за касмічнымі праграмамі адзін аднаго. Ад таго, хто прадэманструе лепшыя вынікі ў космасе, залежаў іх міжнародны аўтарытэт у шматлікіх галінах.

Сёння стаўка падобная. Абедзве краіны даўно нефармальна спаборнічаюць паміж сабой за тытул рэгіянальнага лідэра. З улікам тэмпаў развіцця Індыі і Кітая можна нават казаць пра тое, што пераможца ў касмічнай дуэлі стане кандыдатам нумар адзін на тое, каб адабраць у Злучаных Штатаў статус супердзяржавы XXI стагоддзя.

Асабліва перамога важная для Пекіну. Тут нацыяналізм — адна з ключавых складовых частак дзяржаўнай прапаганды. Менавіта байкамі пра Вялікі Кітай афіцыёз кампенсуе грамадзянам недахоп дэмакратыі, надае сістэме легітымнасць. Параза ад Індыі стане сапраўднай псіхалагічнай траўмай для кітайцаў. Фіяска здольнае выклікаць недавер да эфектыўнасці камуністычнай мадэлі.

У каго больш шанцаў абставіць працўніка ў гонцы за Месяц?

Кітай апошнім часам дасягнуў вялікіх поспехаў у касмічнай галіне. У 2003 годзе першы кітайскі касманаўт пабываў у космасе. У 2007-м Пекін абвясціў, што мае праект адпраўкі чалавека або кіраванага з зямлі карабля на спадарожнік зямлі. Два гады таму быў названы тэрмін будучай экспедыцыі. Калі ўсё складзецца добра, у 2025 годзе на Месяцы ўстановяць чырвоны сцяг КНР.

Але ў кітайскага праекту ёсць і слабыя бакі. Аналітыкі даўно звярнулі ўвагу на тое, што амбіцыйныя заявы Пекіна наконт даследаванняў у космасе сінхронныя з аналагічным паведамленнем з Хьюстану, дзе месціцца штаб-кватэра NASA. Так было і з паведамленнем пра ідэю запусціць кітайскі карабель на Месяц. Інфармацыя з'явілася літаральна на наступны дзень пасля таго, як амерыканцы абвясцілі пра Constellation. Аднак практыка паказвае, што часта за такімі напалеонаўскімі заявамі — дагнаць і перагнаць Амерыку — нічога няма. І ўвогуле, кітайская касмічная навука, як сведчыць тэрмін пасылкі ў космас першага касманаўта, вельмі маладая.

**На думку некаторых экспертаў, Расія, якая, здаецца, не мае магчымасці рэалізаваць такія амбіцыйныя праекты, як дэсант на Месяц, прымаючы ўдзел у праграмах Індыі і Кітая, жадае стаць своеасаблівым арбітрам**

Між тым, тут задача простая — трэба не толькі запусціць карабель, але і авалодаць так званай касмічнай тэхнікай «rendez-vous» (вяртанне). Карабель павінен заставацца на арбіце, пакуль спецыяльны модуль не толькі прызямліцца на Месяц, але і вернецца назад на карабель. Аперацыя вельмі далікатная.

Што да кітайцаў, то яны паспрабуюць правесці першыя эксперыменты з тэхнікай «rendez-vous» ў 2011 годзе. Полем для эксперыменту будзе касмічная станцыя «Tiangong». Акрамя таго, з мінулага года спецыяльны зонд на арбіце Месяца займаецца зборам картаграфічных дадзеных. Яны патрэбныя ў тым ліку, каб знайсці аптымальнае месца для пасадкі модуля.

Пра перспектывы кітайскай Месячнай праграмы можна будзе меркаваць у 2015 годзе. Праз пяць гадоў Пекін збіраецца зрабіць сапраўдны стрэл у космас. Інакш цяжка назваць праект запуску касмічнага карабля «Вялікі Марш–5», які можа перавозіць 25 тон грузаў. Амерыканцы са сваім «Apollo Saturn V», праўда, могуць дастаўляць у космас да 100 тон. Аднак і 25 тон — гэта важны крок на шляху рэалізацыі плану «кітаізацыі» Месяца. У любым выпадку, як пішуць урадавыя кітайскія СМІ, пад Пекінам ужо створаны палігон, які павінен нагадваць паверхню Месяца. На палігоне, як сцвярджае французская «Le Monde», будуць праходзіць выпрабаванні не толькі робаты.

А што Індыя? На фоне суседа яна здаецца больш слабай. Індыйскае касмічнае агенцтва (ISRO) яшчэ не навучылася працаваць з модулямі-робатамі. Толькі ў мінулым годзе індыйскі зонд дасягнуў Месяца. Аднак пры гэтым «Chandrayaan–1» зрабіў важнае адкрыццё: знайшоў на Месяцы элементы вады. Інфармацыя пра ваду на Месяцы, якую знайшлі індусы, была на першых старонках індыйскіх СМІ. Краіну ахапіла сапраўдная эйфарыя. Спецыялісты разглядаюць гэты факт як адзнаку таго, наколькі шмат значыць для краіны Месячная праграма. Адначасова ISRO зрабіла свой прагноз наконт тэрміну, калі індус ступіць на Месяц. Гэта павінна адбыцца не пазней за 2025 год. Тое, што гэта супадае з запланаванай датай высадкі на Месяц кітайскага касманаўта, было ўспрынята ўсімі як выклік Пекіну. Праўда, раней індусам трэба адправіць чалавека ў космас. Гэта павінна здарыцца ў 2015 годзе (на 12 гадоў пазней за Кітай).

Як бачым — пакуль у кітайска-індыйскай бітве за Месяц быццам перамагаюць кітайцы.

Аднак не трэба спяшацца. У Дэлі ёсць свой джокер. Гэта расіяне, якія даўно працуюць у галіне даследаванняў Месяца. Зонд «Chandrayaan–2», які адправіцца на Месяц у 2012 годзе, вырабляецца разам з Роскосмасам. Вядома, што частка эксперыментаў індусаў у космасе адбудуцца на базе станцыі «Саюз».

Аднак расіяне не такія ўжо прастакі, каб дапамагаць аднаму боку. Сяброўства з Індыяй не перашкодзіла ім прадаць кітайцам партыю скафандраў, дзякуючы якім можна выходзіць у адкрыты космас.

На думку некаторых экспертаў, Расія, якая, здаецца, не мае магчымасці рэалізаваць такія амбіцыйныя праекты, як дэсант на Месяц, прымаючы ўдзел у праграмах Індыі і Кітая, жадае стаць своеасаблівым арбітрам. Як мінімум гэта гарантуе тое, што РФ застанецца касмічнай дзяржавай.

А ўвогуле, барацьба за Месяц здольная стаць яшчэ больш інтрыгуючай. Да яе, як лічаць эксперты, могуць далучыцца іншыя дзяржавы. Месячныя амбіцыі ў хуткім часе могуць узнікнуць у Токіо або ў Бруселя.

МЕРКАВАННЕ

# ЯГО САВЕЦКАЯ ЖОНКА

**Адным з наступстваў перамогі Віктара Януковіча на выбарах прэзідэнта Украіны стала гарачая палеміка ў грамадстве вакол пытання, ці здольная ягоная жонка Людміла Януковіч выконваць функцыі першай лэдзі краіны? Пра гэта і іншыя аспекты публічнага і інтымнага жыцця ўкраінскіх палітыкаў журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з кіеўскім палітолагам Уладзімірам Задзіракам.**



**Даведка:**

Людміла Януковіч нарадзілася ў 1949 годзе, закончыла Макееўскі інжынерны інстытут. Пазнаёмілася з будучым мужам у 1969 годзе падчас… разгрузкі цэглы на металургічным заводзе ў Енакіева. Адна з цаглін упала ёй на нагу. Дзяўчыну адвялі ў бытоўку газаўшчыкаў, дзе яна сустрэла Віктара Януковіча. Апошні пашкадаваў Людмілу і прапанаваў ёй вады. У 1972 годзе Людміла і Віктар пабраліся шлюбам. У іх ёсць сыны — Аляксандр і Віктар.

***— Наколькі важны інстытут першай лэдзі ў палітыцы і грамадскім жыцці Украіны?***

— Гэты інстытут ва Украіне вельмі слаба развіты. Жонкі прэзідэнтаў Кучмы і Краўчука былі прадуктамі савецкай сістэмы, дзе жанчына павінна была не праяўляць ініцыятыву, а заставацца ў ценю мужа. Не кажучы пра тое, што правілаў дыпламатычнага этыкету і замежных моваў яны не ведаюць. Баюся, што не толькі беларускаму абывацелю, аднак нават украінскаму нічога не скажуць імёны Людміла Кучма і Антаніна Краўчук. Кантрастам тут выглядае Кацярына Юшчанка. Яна часта з'яўлялася на публіцы, не баялася даваць інтэрв'ю, ярка апраналася. У яе, безумоўна, ёсць густ. Аднак усё тлумачыцца вельмі проста: Кацярына — былая грамадзянка ЗША. Яна вырасла ў часы сексуальнай рэвалюцыі на Захадзе, у выніку якой з'явіўся новы жаночы кодэкс. Менавіта тады стала модна быць адукаванай, самастойнай, цікавіцца палітыкай і культурай.

***— Наколькі вядома, ніякага асаблівага жадання ў Людмілы Януковіч паказвацца на публіцы няма?***

— З самага пачатку палітычнай кар'еры мужа яна ніколі не з'яўлялася на элітных прыёмах або рознага кшталту публічных акцыях. Толькі ў 2004 годзе, падчас выбарчай кампаніі, палітычныя тэхнолагі Партыі рэгіёнаў спрабавалі даць нейкі годны адказ актыўнай і напорыстай Кацярыне Юшчанка. Людміла пачала свяціцца як кіраўнік і патрон дабрачыннага праекту «Ад сэрца да сэрца». У рэпартажах і інтэрв'ю краіна пабачыла пажылую кабету з моцнымі рэлігійнымі перакананнямі, адзетую па модзе савецкіх часоў, якая да таго ж думала савецкімі катэгорыямі. Яна дастаткова слаба разумела правілы піяру: тэксты яе выступаў былі яўна напісаныя не ёй, прычым дрэнна. Аднак само грамадства было не нашмат лепшым, таму, як гаворыцца, «піпл хаваў». Пакуль у лістападзе, уже падчас падзей на Майдане, Людмілу не пусцілі да мікрафона на мітынгу ў Данецку.

***— Гэты эпізод добра вядомы ва Украіне. Аднак для нашых чытачоў варта распавесці больш падрабязна.***

— Паралельна кіеўскаму Майдану Партыя рэгіёнаў вырашыла арганізаваць бела-сіні майдан у Данецку. Там была сцэна, на якой у падтрымку Януковіча выступалі розныя палітыкі, артысты, прадстаўнікі працоўных калектываў. Неяк запрасілі і Людмілу, якая толькі прыехала са сталіцы. Яе выступ стаў сапраўдным падарункам для «аранжавых». Запіс таго выступу адразу выклалі ў інтэрнэт, яго капіравалі на дыскі, з яго зрабілі музычны кліп. Спадарыня Януковіч агучыла ўсе самыя дурныя данецкія страшылкі пра Майдан. Напрыклад, яна паклялася, што ўсе апельсіны, якія раздаюцца ў Кіеве, наколатыя вірусам менінгіту. А напрыканцы Людміла яшчэ паспрабавала нешта спяваць. Усё гэта нагадвала пародыю на Верку Сярдзючку. Прычым вельмі дрэнную. Януковіч адразу пасля той прамовы схаваў жонку далей ад журналістаў.

***— Ці з'яўлялася Людміла Януковіч на публіцы пасля таго скандальнага выпадку?***

— Пяць гадоў пра яе не было нічога чуваць. Хіба што адносіны ўнутры сям'і Януковічаў часта згадвалі як прыклад вернасці і маралі. Магчыма, вы ведаеце, што ўкраінскую эліту ўвесь час страсаюць сексуальныя скандалы? Можна згадаць, напрыклад, выпадак, калі галоўны камуніст збег ад жонкі да маладой журналісткі. Апошні раз Людміла выйшла на публіку ў верасні мінулага года, калі наведвала адзін з данецкіх тэатраў. І зноў скандал. Трэба было ж прыйсці ёй туды, калі на сцэне паказвалі мужчынскі стрыптыз. Артысты гралі шахцёраў, якім з-за крызісу не плацяць заробкі, і якія з-за гэтага вырашылі падацца ў стрыптыз. Людміла Януковіч вытрымала толькі першы акт. Пасля дэманстратыўна сышла з тэатру. Гэта яшчэ больш падагрэла цікаўнасць наконт таго, як, калі і ў якой іпастасі яна з'явіцца на публіцы ў наступны раз. Новая «аранжавая» апазіцыя тым часам актыўна намагаецца прадставіць Людмілу як абсалютна савецкую жанчыну, якая сваімі паводзінамі і заявамі адразу дыскрэдытуе Украіну.

***— Ці ёсць падставы казаць, што Януковіч будзе і далей падчас прэзідэнцкай кадэнцыі хаваць сваю «другую палову»?***

— Беларускі варыянт абмяркоўваецца ў прэсе. Аднак большасць мадэльераў і стылістаў кажуць, што «кліента» можна выратаваць. Людміла магла б змяніць савецкія фасоны на класічныя еўрапейскія жаночыя касцюмы а-ля Маргарэт Тэтчэр. Плюс зразумець сваё абавязкі і рамкі дазволеных дзеянняў. Напрыклад, не дазваляць сабе выказваць асабістую думку, тым больш на тэмы ўнутранай і міжнароднай палітыкі. Прынамсі на першым этапе.



## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### УГА ЧАВЕС

Прэзідэнт Венесуэлы і правадыр Баліварскай рэвалюцыі вырашыў заняцца абаронай гістарычнай архітэктурнай спадчыны. Ён марыць пра рэканструкцыю плошчы імя Вызваліцеля (Сімона Балівара) у цэнтры венесуэльскай сталіцы. Плошча і ўвесь раён вакол павінныператварыцца, па словах Чавеса, у «вялікі гістарычны цэнтр». Першымі ахвярамі урбаністычных канцэпцый прэзідэнта сталі ўладальнікі чатырох будынкаў, якія знаходзяцца на згаданай плошчы. Тут, акрамя таго, месцяцца ненавісныя баліварцам камерцыйныя ўстановы. Улады заявілі, што знешні выгляд дамоў не адпавядае новай канцэпцыі цэнтра Каракаса. На першым этапе вырашана будынкі канфіскаваць у іх уладальнікаў. Мэр горада заявіў, што пакуль не ведае, як будуць перароблены будынкі. Між тым, сам прэзідэнт у рамках аўтарскай тэлевізійнай праграмы «Алё, прэзідэнт!» прапанаваў свой варыянт. «Узарвіце іх, — заклікаў Чавес. — Плошча — уласнасць усіх венесуэльцаў. Гэта месца гістарычнага цэнтра, які мы павінны пабудаваць». Застаецца дадаць, што дасюль ніхто не бачыў плана таго самага праекту ператварэння цэнтра Каракасу ў гістарычную зону.

### АЛЕЎЦІНА АПАРЫНА



Дэпутат расійскай Дзяржаўнай думы ад Камуністычнай партыі (КПРФ) парушыла старыя забабоны КПРФ наконт Дня святога Валянціна. Як вядома, доўгі час расійскія камуністы лічылі Свята ўсіх закаханых антыправаслаўнай і антыславянскай правакацыяй. Быццам гэта кляты Захад навязвае свята маладым расіянам. У Валгаградзе, напрыклад, раней 14 лютага камуністы заклікалі моладзь не дарыць адзін аднаму «валянцінкі», а наведаць мемарыял, прысвечаны героям сталінградскай бітвы. І вось упершыню адзін з лідэраў КПРФ парушыў правіла. Апарына ў адпаведным лісце патрабавала ад свайго роднага валгаградскага абкому абавязкова павіншаваць маладых людзей з днём усіх закаханых. Яна ўжо прыдумала падставы для рэабілітацыі святога Валянціна: за шаснаццаць стагоддзяў існавання свята быццам бы страціла каталіцкую сутнасць і набыло універсальны сэнс і маштаб. Акрамя таго, у славян таксама было свята кахання — Купалле. Учынак Апарынай многія аналітыкі разумеюць як знак правалу моладзевай палітыкі КПРФ. Іншыя бачаць у гэтым асцярожны пошук новага іміджу кампартыі. Як вядома, Руская праваслаўная царква — старадаўні праціўнік Дня ўсіх закаханых — адкрыта блакіруецца з крамлёўскай адміністрацыяй.

### ЭРЫКА ШТЭЙНБАХ



Сябра кіраўніцтва Саюза хрысціянскіх дэмакратаў (CDU), дэпутат Бундэстагу і лідэр Аб'яднання выгнаных (арганізацыя нашчадкаў немцаў, якіх прымусова дэпартавалі пасля вайны з Чэхіі і Польшчы) стала галоўным партыйным канкурэнтам Ангелы Меркель. Яна і раней прыносіла канцлеру шмат праблем. Напрыклад, ініцыятыва Штэйнбах заснаваць Цэнтр выгнаных выклікала негатыўную рэакцыю ў Варшаве. Хутка з'явілася новая тэма для канфлікту паміж жанчынамі-палітыкамі. Меркель хацела б рэфармаваць Аб'яднанне выгнаных у дабрачынны фонд, які будзе займацца развіццём польска-нямецкіх кантактаў. Аднак Штэйнбах упарта адмаўляецца рэфармаваць арганізацыю. Яна зрабіла скандал з таго, што яе не пусцілі ў кіраўніцтва ўрадавага фонду, які павінен працаваць па праблеме выгнаных. У выніку фраў Эрыка зрабіла сабе імідж лідэра ўнутрыпартыйнай апазіцыі. Сапраўды, яна добра пасуе для такой ролі. Меркель бачыць партыю як арганізацыю сярэдняга класа, жанчын, жыхароў буйных гарадоў і людзей еўрапейскіх поглядаў. Штэйнбах, наадварот, выступае супраць мадэрнізацыі, за тое, каб моцна трымацца хрысціянскіх каштоўнасцей і прынцыпаў нямецкай правай традыцыі. Апошняе, дарэчы, значыць непрызнанне цяперашняй усходняй мяжы ФРГ. Штэйнбах нават заявіла, што палякі выкарысталі Гітлера як падставу для даўняга плану выцяснення немцаў за Одэр. Застаецца дадаць, што бацька Штэйнбах (яна нарадзілася ў 1943 годзе) — былы салдат Вермахту. Спрэчка мадэрнізатараў і кансерватараў яшчэ не перарасла ў адкрытае супрацьстаянне, аднак добра дэманструе, што партыя Меркель ідэйна далёка не маналітная.

▸ КІРМАШ

# «НЯМА КАГО БАЙКАТАВАЦЬ»

## БЕЛАРУСКІЯ ПРЫВАТНЫЯ ВЫДАЎЦЫ НЕ СУПРАЦЬ АБ'ЯДНАЦЦА

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

**10–14 лютага ў выставачным цэнтры БелЭКСПА праходзіць XVII Міжнародны мінскі кніжны кірмаш. Па новай беларускай традыцыі, у такой, здавалася б, важнай для любога сур'ёзнага выдаўца падзеі амаль не фігуруюць беларускія прыватныя выдавецтвы, на плечы якіх у наш парадаксальны час пакладзена місія развіцця беларускай мовы, літаратуры, кнігі — актуальнай, цікавай як чытачу, так і крытыку. Напярэдадні адкрыцця выставы культаглядальніца «НЧ» пацікавілася ў прадстаўнікоў малога кніжнага бізнесу Беларусі, ці свае яны на гэтым свяце жыцця.**

Паводле дадзеных Міністэрства інфармацыі РБ, у 2009 годзе ў краіне было выдадзена 1884 кнігі на беларускай мове агульным накладам 5,26 мільёна асобнікаў. Калі ўзяць да ўвагі ўвесь аб'ём выдадзеных кніг, колькасць беларускамоўных пазіцый складае 14% спісу, а наклад — 23% ад сумарнага накладу. Мінінф зазначае: большасць кніг на беларускай мове — прадукцыя прыватных выдавецтваў.

Здавалася б, лічбы не такія ўжо фатальныя. Таму, хто сачыў за кніжнымі навінкамі цягам года, відавочна: калі адкінуць «масоўку» — падручнікі і камерцыйную літаратуру, беларускаму сумарнаму кнігадруку ёсць чым ганарыцца і ў высокамастацкіх сферах. І цалкам заканамерна было б пабачыць найлепшае выдадзенае за апошнія месяцы на стэндах кніжнага кірмашу ў шырокім доступе. Але з года ў год так не адбываецца. Гэтак, сёлета на стэндах днём з агнём нельга было адшукаць «найлепшыя кнігі–2009»: «Цэнтр Еўропы» Уладзіміра Някляева (выдавецтва «Медысонт»; версія «Радыё Свабода») і «Нацыянальнасць — беларус» Алега Латышонка (Вільня: Інстытут Беларусістыкі/Беласток: Беларускае гістарычнае таварыства; версія «Нашай нівы»).

Невядомыя пісьменнікі прадстаўляюць беларускую культуру па-руску ад імя народа і дзяржавы, вядомых можна сустрэць між стэндаў як шараговых наведнікаў, што выправіліся на кірмаш папоўніць хатнюю бібліятэку. Чаму так? У сваім мінірасследаванні я паспрабавала адшукаць іншыя прычыны, апроч ідэалагічных.

### Умоўнасць адзінак

Паводле дакументаў, даступных на сайце Міністэрства інфармацыі РБ, удзел у кірмашы можа ўзяць любы зарэгістраваны суб'ект выдавецкай дзейнасці. Умова адзіная: умоўныя адзінкі — плата за месца пад стэнд. Паводле прайсаў Мінінфа, 1 квадратны метр стэндавай плошчы каштуе ад 90 у.а. на ўвесь час выставы-кірмаша (у якасці у.а. выступаюць еўра). Мінімальная плошча, якую можна арэндаваць, — 2 квадратных метры. Такім чынам, ахвочы прадэманстраваць цуды паліграфіі шырокаму чытачу павінен перавесці на рахунак дзяржавы 180 еўра — гэта прыкладна 720 тысяч рублёў. Дадайце сюды расходы на рэкламу, транспарт, удзел у каталозе выставы… «Штука баксаў» — вось цана ўдзелу суб'екта кніжнага рынку ў галоўным выдавецкім свяце краіны.

Як паказвае апытанне, усе як адзін прыватныя выдаўцы, зарэгістраваныя ў Беларусі, лічаць удзел у кірмашы на такіх умовах вар'яцтвам. Паколькі ў прыватных выдавецтваў аб'ёмы кніжнай прадукцыі вельмі малыя, ніхто з іх не мае рэсурсаў нагандляваць за чатыры дні і на палову гэтай сумы. Пра гэта мне



**На адкрыцці XVII Міжнароднага кніжнага кірмашу Міністэрства інфармацыі сімвалічна біла ў званы ўзаемапаразумення**

незалежна адно ад аднаго паведамілі Ігар Логвінаў (выдавецтва «Логвінаў»), Міхась Башура («Галіяфы»), Марына Шыбко («Лімарыюс»), Генадзь Вінярскі («Беларускі кнігазбор»), выдаўцы Зміцер Колас і Віктар Хурсік.

У гэтых і іншых малых выдавецтваў пацыху, але стабільна выходзіць класіка еўрапейскай літаратуры ў беларускіх перакладах, беларуская «няшкольная» класіка, актуальная беларуская літаратура, філасофія, публіцыстыка. Без камерцыйнага лоску або дзяржаўнай падтрымкі — на замежныя гранты ці за кошт аўтараў. Яна карыстаецца попытам, але не акупляецца. Смешная для любога іншага бізнесоўца сума арэнды ў 180 еўра здаецца прыватным выдаўцам, якія і так сплачваюць высокія дзяржаўныя падаткі, непад'ёмнай.

### Ступень удзелу

Ігар Логвінаў — флагман прыватнага выдавецкага бізнесу — мае краму на супрацьлеглым ад БелЭКСПА беразе Свіслачы і ў дзень адкрыцця кірмашу сімвалічна ўнёс туды касавы апарат. Магчымасць выхаду на публіку 10–14 лютага ён без комплексаў ігнаруе, хоць падкрэслівае: Міністэрства інфармацыі і «Белкніга» (дзяржструктуры — суарганізатары кірмашу) знялі ранейшыя строгія і абсурдныя забароны на распаўсюд яго прадукцыі.

Генадзь Вінярскі тлумачыць, што апроч «дарагіх коштаў арэнды, несупастаўных з абаротам», нежаданне «Беларускага кнігазбору» купляць уласны стэнд выклікана наступным: выдавецтва не бачыць патрэбы рэкламаваць сваю прадукцыю. «Мы ўжо вывучылі свайго чытача. Нашы пакупнікі на такія выставы не ходзяць, а той, хто ходзіць, беларускай класікай не цікавіцца», — адзначае ён. Шанец адкрыць вочы такім незацікаўленым, прыцягнуць іх увагу асобным стэндам на кірмашы, паводле яго досведу, мізэрны. Зрэшты, кнігі «БК» можна было пабачыць на стэндзе.

Зміцера Коласа маё тэлефанаванне прысцела за стырном. У дзень мантажу выставы ён падвозіў туды кнігі. «Стэнду няма, — лаканічна акрэсліў Колас свой статус, — але мае кнігі будуць прадстаўленыя на выставах замежных удзельнікаў». Дзве навінкі пад маркай «Зміцер Колас» можна на гэтым тыдні памацаць на стэндзе Францыі (сёлета гэта краіна — спецгосць кірмашу). Не маючы магчымасці арэндаваць экспазіцыйную плошчу, выдавец возьме ўдзел як просты наведнік — у мерапрыемствах, якія ладзяць замежныя госці кірмашу польскі Інстытут Кнігі і мінскі Інстытут Гётэ.

Міхася Башуру я вытэлефанавала 9 лютага непасрэдна перад пачаткам семінараў Інстытута Гётэ «Удзел у кніжным кірмашы: як зрабіць стэнд паспяховым» і «Структура і арганізацыя кірмашоў». «Галіяфы» — таксама шараговыя наведнікі кірмашу. Галіяфаўскі зборнік «Сучаснае шведскае апавяданне» сёлета экспануецца на стэндзе Швецыі.

Віктар Хурсік — адзіны ўладальнік малога выдавецтва, які ў 2009-м адважыўся на стэндавы ўдзел у кірмашы, нягледзячы на тое, што прадаваў там усяго дзве кніжныя пазіцыі. «Была такая памылка — прызнаўся Хурсік па тэлефоне, — больш так рабіць не буду. Дорага». Паводле яго словаў, авантура не акупілася і прынесла яго справе адны выдаткі.

Выдавецтва «Лімарыюс», як і штогод, прадстаўлена на кірмашы на ўзроўні бясстэндавага ўдзелу. Гэта азначае прысутнасць інфармацыі пра іх дзейнасць у каталозе мерапрыемства і каштуе 20 у.а. Выдавец Марына Шыбко перакананая: «Удзельнічаць, прадстаўляць сябе трэба». Але на ўласны стэнд у «Лімарыюса», дзе пабачыла свет найлепшая кніга–2008 па версіі «Нашай нівы» (анталогія беларускага паэтычнага перакладу ХХ стагоддзя «Галасы з-за небакраю»), няма сродкаў. Шыбко памятае 1990-я гады, калі Міжнародныя кірмашы ў Мінску не былі яшчэ «-наццатымі», а яна толькі пачынала бізнес. Тады арэнда плошчы была значна меншай, а імпэт заявіць пра сябе — значна большым: «Я выстаўляла тры сшыткі і была задаволеная сабой», — згадвае спадарыня Марына.

Буйны выдавецкі камбінат, датаваны дзяржавай, — і некамерцыйная серыя мастацкага перакладу, якая прапагандуе каштоўнасці, што разыходзяцца з пануючай у краіне ідэалогіяй… Слон і моська пастаўленыя ў роўныя ўмовы. Свядома ці не гэта адбываецца? Якія шляхі падтрымкі прыватных выдавецтваў можа прапанаваць дзяржава? На жаль, прадстаўнікі кампаніі «Макбел» — суарганізатара кірмашу, на мае пытанні адказваць адмовіліся, спаслаўшыся на шалёную занятасць выставай: «Вось вам мая візітоўка, але слухаўку я ўсё роўна здымаць не буду».

Але асноўная праблема вызначаная. Лагічны крок — пошук шляхоў вырашэння. «А ці не спрабавалі вы аб'ядначца?» — такім было маё наступнае пытанне да выдаўцоў.

### Магутнасць кучкі

Як выяўляецца, ідэя заявіць да ўдзелу аб'яднаны стэнд незалежных выдавецтваў была, але кожны год яна заставалася на ўзроўні размоваў. Прадпрымальнікам бракуе «дробязі»: рухавічка, ініцыятара. Ігар Логвінаў і Міхась Башура — за каапераццыю. Віктар Хурсік не чуў такіх прапановаў, але з радасцю адкугнуўся б на іх, калі б яны паступілі: «Мне нястрашна выстаўляць свае выданні поруч з іншымі: кніга гаворыць сама за сябе». Выдаўцы салідарныя: «Аб'ядналы стэнд — гэта выйсце… Не можа быць мовы пра канкурэнцыю… Мы ўсе робім адну справу».

Гарачая прыхільніца аб'яднання — Марына Шыбко: «Мне было б сорамна выстаўляць усю прадукцыю — няшчасныя 22 сшыткі, як гэта змушаныя рабіць дзяржаўныя прадпрыемствы. Выдавецтва можа прадукаваць 20 кніг у год, але вартымі экспазіцыі на міжнародным узроўні палічыць толькі адну-дзве з іх. Гэта нармальна. І добрае рашэнне тут — аб'ядналы стэнды». Спадарыня Марына нават пачуваецца вінаватай, што не стала прасоўваць ідэю далей пасля таго, як не падтрымалі калегі. Мы размаўлялі 10 лютага, ужо пабываўшы на выставе: «З кожным годам экспазіцыя ўсё прыстойней. Гэта высокаўзроўневае мерапрыемства. Тут няма каго байкатаваць».

Можна доўга казаць пра тое, што эканамічныя праблемы створаныя штучна, і гэта насамрэч прыхаваная палітычная цэнзура ў дачыненні да незалежнай ад дзяржідэалогіі кнігі. Як наконт праверыць гэта дзеяннем? Будзем аптымістамі і паверым у магчымасць супрацоўніцтва дзяржавы і недзяржаўных культурных ініцыятыў. Ідэя аб'яднанага ўдзелу прыватных выдаўцоў у 18-м, «поўнагадовым» кніжным кірмашы ў Мінску, сапраўды гучыць як выйсце — з культурнага гета.

▸ АБ'ЯВА

**СЛОВЫ ЛЮБОВІ**

Літаратурная вечарына, прысвечаная Дню святога Валянціна.

Творчая суполка «ЛІТО-Беларусь» вынайшла формулу кахання: 3*3=13.

13 лютага, напярэдадні Свята ўсіх закаханых, 3 дзівы сучаснай беларускай літаратуры: Марыйка Мартысевіч, Віка Трэнас і Валярына Кустава прызнаюцца ў каханні сваім паэтычным кумірам. Кожная прадставіць па тры аўтары.

**У праграме:** Уладзімір Някляеў, Леанід Дранько-Майсюк, Андрэй Хадановіч, Серж Мінскевіч, Андрэй Адамовіч, Усевалад Сцебурака, Андрэй Касцень, Віталь Рыжкоў, Андрэй Сузінь

Словы любові прагучаць **13 лютага а 17:00 у Музеі Янкі Купалы.** Уваход вольны. Гасцей чакае латарэя з прызамі ад удзельнікаў вечара і кампаніі «Будзьма!»

ЛЁСЫ

# ДРЭЗДЭН: ПАЎСТАННЕ З ПОПЕЛУ

Аляксей ХАДЫКА

**У Беларусі і Дрэздэна, сталіцы Саксоніі, шмат гістарычных сувязей. Кожны наш суайчыннік можа без сумневу сцвярджаць, што ў стварэнне аднаго з буйнейшых музеяў свету ўкладзена праца яго продкаў — сплачаныя дзяржаве падаткі.**



Дрэздэн. 1945 г.

Большую частку XVIII стагоддзя ў Рэчы Паспалітай кіравалі два прадстаўнікі саксонскай дынастыі, першы з якіх, Аўгуст II Моцны (1670–1733), быў фундатарам аднаго з сімвалаў Дрэздэна, царквы Фраўэнкірхе, і пачынальнікам пашырэння знакамітай Дрэздэнскай карціннай галерэі. Колькасць твораў мастацтва ў ёй за часы Аўгуста II і яго сына Аўгуста III вырасла ў дзесяць разоў — з пяцісот да пяці тысяч. У 1754 годзе галерэя ўзбагацілася і самым дарагім набыткам — Сіксцінскай мадоннай Рафаэля.

## Ацалелы салдат

Мінск і Дрэздэн маюць яшчэ адну агульную рысу асабістага лёсу: яны амаль дашчэнту былі знішчаныя бамбардзіроўкамі ў другую сусветную вайну. Горкі лёс напаткаў Дрэздэн 65 гадоў таму напярэдадні папулярнага сёння Дня святога Валянціна.

13–14 лютага 1945 года амерыканскі салдат, захоплены ў палон падчас Ардэнскай контрнаступальнай аперацыі немцаў, застаўся жывы падчас бамбавання саюзнікамі Дрэздэна.

Менавіта ў Дрэздэне ў гэтыя дні ён апынуўся разам з сотняй сваіх сяброў па няшчасці. З сотні іх ацалела сямёра. Лічыцца, што страты цывільнага насельніцтва Дрэздэна склалі ад 25 да 30 тысяч, так сцвярджала тагачасная закрытая статыстыка, гэту лічбу называюць і нямецкія эксперты, якія праводзілі спецыяльнае даследаванне ў 2008 годзе. Пра 200 тысяч замардаваных крычала гебельсаўская прапаганда. Савецкія гісторыкі казалі пра 135 тысяч, як і англійскі даследчык Дэвід Ірвінг, лічбу якога паўтарыў прыгаданы амерыканскі салдат.

Салдата звалі Курт Ванегут. У знакамітым рамане 1969 года «Бойня №5, або Крыжовы паход дзяцей», праз успаміны свайго героя Білі Пілігрыма ды ўласныя, пісьменнік распавёў пра падзеі тых страшных дзён. Раман, відавочна антываенны, цэнзураваўся ў ЗША, затое яго з ахвотай друкавалі ў СССР, аддаючы належнае моцнай, выразнай прозе. (Яго пераклад па-беларуску падрыхтаваны Паўлам Касцюкевічам, які пакуль вядомы як перакладчык з іўрыту, прыгадайма складзены ім зборнік Эдгара Керэта «Кіроўца аўтобуса, які хацеў стаць Богам»).

«… Ён быў унізе, у халодных сутарэннях, у тую ноч, калі разбамбілі Дрэздэн. Наверсе чуліся гукі, падобныя да тупату велікаяў. Гэта выбухалі шматтонныя бомбы. Веліканы тупалі і тупалі.





Фраўэнкірхен: 1970 г. і сёння

Але сутарэнні былі надзейным сховішчам. …Да поўдня назаўтра выходзіць са сховішча было небяспечна. Калі ж амерыканцы і іхняя ахова выйшлі навонкі, неба было скрозь ахутана чорным дымам. Злое сонца падавалася навершшам цвіка. Дрэздэн выглядаў падобна да Месяца — адны мінералы. Камні расплавіліся. Смерць была наўкола…»

Колькасць бомб, што абрынулася на горад, крыніцы падаюць дакладней, чым лічбу іх ахвяр. Двюма хвалямі, у 22.14 і 01.21, у ноч з 13 на 14 лютага прайшлася над горадам авіяцыя брытанскіх Каралеўскіх ВПС на «Ланкасцерах», скінуўшы 2659,3 тоны фугасных і запальвальных бомб. Атакавалі 800 самалётаў. Брытанцы страцілі толькі 6 экіпажаў: паветраная абарона горада была вельмі слабая. 14 і 15 лютага па чыгуначным вузле ўдарылі амерыканскія «Б–17»: 530 самалётаў, 1247,6 тоны бомб. Бамбавалі кожны раз у тры прагоны: фугасамі, каб знішчыць перакрыцці і сцены, потым запальвальнымі бомбамі, потым зноў фугасамі, каб перашкодзіць тушэнню пажараў. Тэмпература ў паўсталых вогненных смерчах сягала 1500 па Цэльсію. Шкло, камні, мінералы плавіліся. Ёсць страшныя сведчанні ацалелых, якія бачылі людзей, што згаралі жыўцом.

Няма нічога дзіўнага, што ў цыклапічных завалах пасля бамбавання, каб пазбегнуць эпідэміі, не маючы моцы дастаць і пахаваць усіх, целы памерлых пазней палілі агнямётамі. Вогненная магіла апошніх дзён вайны.

## Згода саюзнікаў

Вядома, што бамбаванні нямецкіх гарадоў, у прыватнасці Лейпцыга і Берліна, узгадняліся саюзнікамі 4 лютага 1945 года на ялцінскай канферэнцыі. Распачаты Савецкай арміяй 12–13 студзеня наступ у Польшчы і Усходняй Прусіі камандаванне саюзнікаў вырашыла падтрымаць, перашкодзіўшы перакідванню нямецкіх войскаў з Заходняга фронту, якое магло паставіць туды каля 40 дывізій. Асабіста Уінстан Чэрчыль даў распараджэнне міністру брытанскіх ВПС Арчыбальду Сінклеру даследаваць магчымасць нанясення спецыяльных паветраных удараў.

Застаюцца спрэчкі: ці абмяркоўвалася бамбаванне менавіта Дрэздэна з савецкім бокам у Ялце. Англійскія крыніцы сцвярджаюць, што намеснік начальніка штаба англійскіх ВПС Чарльз Портал, прысутны ў Ялце, такі спіс з Дрэздэнам савецкай дэлегацыі прадставіў. У сваю чаргу, амерыканцы сцвярджаюць, што 8 лютага іх ваенная місія ў Маскве паведамляла саюзнікам пра ўключэнне Дрэздэна ў пералік аб'ектаў бамбавання. У савецкіх афіцыйных дакументах такая інфармацыя пакуль не знойдзена.

## Разбурэнне і розгалас

Уласна, спрэчка пра тое, хто ведаў і пагаджаўся на знішчэнне Дрэздэна, а хто не, узнікла ў выніку вялікага розгаласу гэтай ваеннай аперацыі і неадназначага адказу на пытанне: а ці было яно стратэгічна неабходным. Дакументы амерыканскіх ВПС, якія ўлічваюць брытанскія ацэнкі, сцвярджаюць пра сур'ёзнае пашкоджанне 23 % прамысловых будынкаў і 56 % непрамысловых, без уліку жылых.

У горадзе з даваенным насельніцтвам у 642 тысячы чалавек было разбурана 78 тысяч жылых дамоў, яшчэ 27,7 тысячы сталі непрыдатнымі для жыцця, а 64,5 тысячы рамонту падлягалі або ацалелі. Дрэздэн, праўда, не быў суцэльна мірным горадам, і яго прамысловасць выраблялa не толькі фарфор: на 110 ваенных прадпрыемствах, у тым ліку знакамітых аптычных фабрыках Zeiss, працавала больш 50 тысяч чалавек. А чыгуначная масты праз Эльбу, якія разбурылі налётамі, адыгрывалі жыццёвае значэнне для перакідвання нямецкіх войск. Аднак нават Чэрчыль, уражаны вынікамі налётаў, назваў іх сур'ёзнай нагодай супраць правядзення саюзнікамі бамбардзіровак: «Іначай мы атрымаем пад свой кантроль цалкам разбураную дзяржаву».

Нямецкі пісьменнік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі Гюнтэр Грас увогуле называў дрэздэнскую катастрофу ваенным злачынствам. А сучасныя нямецкія правыя палітыкі з Нацыянал-дэмакратычнай партыі, якая ў 2004 годзе атрымала месцы ў Саксонскім ландтагу, прымяняюць выраз «бомбавы халакост». Іх прадстаўнік Хольгер Апфель лічыць падзеі 13–14 лютага 1945 года «сспланаваным індустрыяльна-масавым знішчэннем немцаў».

Так ці інакай, яны балюча адбіліся ў памяці немцаў. Калі яшчэ ў часы ГДР з'явілася традыцыя 13 лютага па дзесятай вечара званіць ва ўсе царкоўныя званы ў памяць пра трагедыю, а потым да яе далучыліся цэрквы ў Заходняй Германіі, Дзяржпартамент ЗША зрабіў спецыяльную заяву пра тое, што паветраная атака на Дрэздэн выконвалася па просьбе СССР.

## Культурныя страты

Для размяшчэння Дрэздэнскай галерэі выкарыстоўваецца найпрыгажэйшы комплекс будынкаў — Цвінгер, спраектаваны славутым нямецкім архітэктарам Матэусам Пёпельманам у 1710–1720-я гады. Ён, як і прыгаданая намі царква Фраўэнкірхе, у 1945 годзе быў знішчаны амаль цалкам. У пажары загінула 197 карцін.

Творы мастацтва не ўмеюць бараніцца самі. На шчасце, большасць шэдэўраў галерэі былі за некалькі тыдняў перад налётам перахаваныя ў шахты, каменяломні і іншыя, часам не заўсёды прыстасаваныя месцы немцамі. Іх выратаванне, эвакуацыя ў Маскву Савецкай арміяй — ужо пазітыўная частка гісторыі.

Адрэстаўраваныя лепшымі спецыялістамі, пасля ашаламляльнай выставы ў Маскоўскім музеі выяўленчага мастацтва імя Пушкіна, 1240 карцін вярнуліся ў Дрэздэн. Якія імёны — Бацічэлі, Гальбейн, Кранах, Дзюрэр, Ван Эйк, Рубенс, Тыцыян, Рэмбрант… І «Сіксцінская мадонна» Рафаэля.

Цікава, што да 2005 года ў Мінску жыў адзін з вайскоўцаў, што знайшоў карціны галерэі пад Дрэздэнам, палкоўнік Іван Бяко — зняць фільм пра яго гісторыю збіраўся, але не паспеў Уладзімір Сцяпан. У тым жа 2005 годзе дрэздэнцы аднавілі Фраўэнкірхе, якая доўгі час стаяла ў руінах напамінам пра жахі вайны. А зараз зноў нагадвае пра неўміручасць шэдэўраў архітэктуры і пра нашага колішняга агульнага з саксонцамі суверэна, яе фундатара Аўгуста II Моцнага.

У «Бойні №5», фантастычным рамане Курта Ванегута, час для яго героя Білі Пілігрыма існуе ў непарыўным кантынууме, смерць існуе неадлучна ад жыцця. На шчасце, і ў рэальнасці жыццё вяртаецца ў знявечаныя вайной гарады. Чым Курт Ванегут, які пакінуў гэты свет 11 красавіка 2007 года, спадзяюся, быў бы ўсцешаны.



Цвінгер сёння

ЮБІЛЕЙ

# 200 ГАДОЎ ІВАНУ ХРУЦКАМУ

Аляксей ХАДЫКА

**8 лютага (27 студзеня па старым стылі) 1810 года, 200 гадоў таму, у мястэчку Ула на Лепельшчыне нарадзіўся самы вядомы беларускі мастак XIX стагоддзя Іван Хруцкі. Каму з дзяцінства не сустракаліся паштоўкі з рэпрадукцыямі яго шыкоўных нацюрмортаў? Яго творчасці прысвечаны дзесяткі публікацый, уключаючы вялікі альбом-каталог І. Паньшынай і А. Рэсінай, выдадзены яшчэ да 180-годдзя мастака. У экспазіцыі Нацыянальнага мастацкага музея пасля яе аднаўлення — шыкоўны выбар палотнаў Хруцкага.**


Іван Хруцкі. Аўтапартрэт. 1884

Яго лёс пераплецены з няпростай гісторыяй Беларусі. Будучы мастак прыйшоў на свет у сям'і уніяцкага святара Фамы Хруцкага ў тыя часы, калі краіна, пераўтварыўшыся ў правінцыю Расійскай імперыі, імкліва губляла рысы сваёй тоеснасці. Таму пасля заканчэння ў 1827 годзе курса свабодных мастацтваў Полацкага вучылішча, спадчынніка езуіцкай акадэміі, 17-гадовы хлопец накіраваўся не ў Вільню, дзе універсітэцкая мастацкая школа дажывала апошнія гады перад ліквідацыяй, а ў Пецярбург.

Здавалася б, сталіца імперыі, выдатныя магчымасці прафесійнага дасканалення. Ён прайшоў праз вольныя курсы пры Акадэміі мастацтваў і клас партрэтыста Аляксандра Варнека, праз капіяванне еўрапейскіх шэдэўраў жывапісу ў Эрмітажы. Хутка надышло прызнанне — за творы ў нязручным, «невысакародным» жанры нацюрморта, у якім Хруцкі дасягнуў выдатнай дасканаласці. Чароўны свет прыгожых прадметаў, мастацтва дзеля прыгажосці. Вобразы юных пані, хлопчыкаў — як у райскім садзе.

Заканчваючы Акадэмію мастацтваў у 1836 годзе, ён атрымлівае ад Савета АМ вялікі сярэбраны медаль за нацюрморт «Кветкі і плады». Праз год — прызнанне ад царскай сям'і і падарунак — гадзіннік з залатым ланцугом: Мікалая І прывабілі вобразы дзяцей з садавіной. Яшчэ праз год — малы залаты медаль Акадэміі, а ў 1839 годзе і званне акадэміка за «выдатныя працы ў партрэтнай, пейзажнай і асаблівa ў жывапісе пладоў». У 29 гадоў — вяршыня кар'еры: на ўра ідуць не толькі нацюрморты з садавінай і збаночкамі моднай фаянсавай фабрыкі Паскочына, фірменным знакам мастака. Ён запатрабаваны і як партрэтыст.

Але ў сярэдзіне 1830-х разгараецца канфлікт, які пераламіў лёс мастака. Імперыя падступаецца да ліквідацыі уніяцкай царквы, бацька Хруцкага ў 1836 годзе адлучаны ад прыхода і пад пакаранне епітым'яй адпраўлены ў манастыр. Здаецца, яшчэ ўсё можна паправіць: ёсць сувязі ў вышэйшым свеце, мастак блізкі з перадапошнім кіраўніком уніяцкай царквы Ясафатам Булгакам, шыкоўны партрэт якога піша ў 1838 годзе і да якога звяртаецца па дапамогу. Палёгка прыходзіць часовая: бацька дажывае да 1839 года, калі царква, з якой звязаны яго служба і жыццё (зрэшты, як і рэлігійнае жыццё большасці беларусаў), ліквідуецца. А кіруе яе знішчэннем мітрапаліт-здраднік Іосіф Сямашка, герой іншага партрэта Хруцкага.

Бывай, чужая сталіца! Увесну 1840 года Хруцкі, атрымаўшы ў Акадэміі мастацтваў дакументы, паспрабаваў уцячы ад афіцыйнага жыцця ды замоваў і схавацца на роднай Віцебшчыне, апякуючыся маці, двума малодшымі братамі (яны таксама прысвяцяць сябе жывапісу) і трыма сёстрамі. Да 1844 года куплены маляўнічы маёнтак Захарнічы ў 20 кіламетрах ад Полацка, дзе мастак будуе дом, і ў 1845-м бярэ шлюб са шляхцянкай Ганнай Бямбноўскай, дачкой паплечніка Касцюшкі. Але вызваліцца з абдымкаў афіцыёзу Хруцкаму не давялося.

У 1846 годзе мастака знаходзіць Сямашка: можна толькі ўявіць, што адчуваў мастак, вымушаны ў Вільні аздабляць яго архірэйскі дом, маляваць партрэты праваслаўнага кліру, халодныя, фармальна-афіцыёзныя, пісаць у расійскія храмы абразы. Здрада, здрада памяці бацькі…

Толькі пасля 1854 года ён здолеў вызваліцца ад апекі Сямашкі. Яго чакаюць Захарнічы, сям'я. Магчымасць зачыніцца ад варожага свету: відаць, таму ў апошнія перыяд жыцця, да смерці ў 1885 годзе, ён стварае настолькі мала. Некалькі нацюрмортаў, пакоі роднага дома, погляд у сябе — аўтапартрэт. І даніна апошняй павагі ідэалам, якія былі блізкія ў маладосці. Яны ўвасобіліся ў вобразе Адама Міцкевіча, намаляваным у сярэдзіне 1850-х, блізка часу смерці паэта, паводле фотаздымку. Ці гэта быў успамін пра далёкае юнацтва, 1828 год у Пецярбурзе, пра агульнае кола знаёмых, дзе маглі спаткацца іншы беларускі мастак, Іосіф Аляшкевіч, малады Міцкевіч і 18-гадовы Хруцкі?

У альтэрнатыве супрацьстаянне — сыход у прыватнае жыццё, без уліку прыстасаванства і кар'еры, што стаяла перад кожным адукаваным жыхаром Беларусі ў XIX стагоддзі, Хруцкі абраў сыход у асабісты свет. Можа, таму яго нацюрморты адметныя, чароўныя, загадкавыя, як знак выбару жыццёвага шляху?

ФЕЛЬЕТОН

# НА ФРАНТАХ ІДЭАЛАГІЧНАЙ ВАЙНЫ

Алег НОВІКАЎ

**Цяжка ўявіць, што будзе на дзяржпрадпрыемствах, калі тыя, хто адказвае за ідэйную працу, пачнуць дэталёва выконваць інструкцыі галоўнага камісара краіны Наталлі Пяткевіч.**

— …І выйсці ў наступнай пяцігодцы на ўзровень сярэдняга заробку па краіне ў памеры 500 долараў ЗША.

Сказаўшы пра пяць касых баксаў, дакладчык — мужчына гадоў трыццаці — узняў галаву і паглядзеў на аўдыторыю. Нават пры дрэнным святле — у бытоўцы гарэла толькі адна (і тое так сабе) лямпа, было бачна, якой непадробнай цікавасцю да ягонай лекцыі свецяцца вочы прысутных. Старанна (некаторыя нават высунулі языкі) хлопцы і дзяўчаты з брыгады электрыкаў канспектавалі лекцыю.

— Прабачце, — узняў руку хлопец з пірсінгам у носе, — у мяне пытанне: а колькі тон азімых намалацілі ў Гомельскай вобласці ў 1999 годзе?

Дакладчык парыўся ў сваіх паперках.

— Два мільёны тон.

— Крута!

Выступоўца перагарнуў старонку канспекта.

— А цяпер пераходзім да пытанняў міжнароднага становішча. Як вы ведаеце, наша краіна з'яўляецца ахвярай ціску заходніх дзяржаў і іх пятай кал…

У гэты момант у дзверы пастукалі. Лектар змоўк і пачаў нервова мітусіцца па памяшканню.

— Што рабіць? Што рабіць? Гэта ён!

— У шафу для інструментаў. Хутка! — загадаў бывалы сівы брыгадзір. — А вы, — ён кінуў сваім прысутным, — прыкінецеся шлангамі.

Ледзь паспеў лектар утрамбавацца ў шафу, а працоўныя дастаць пляшкі з-пад віна і зрабіць інсталяцыю дзяжурнага бухалава, як на парозе ўзнікла фігура чалавека паважанага ўзросту з папкай у руках. Усё — акуляры, касцюм савецкага пакрою, гальштук — выдавала ў ім ідэолага.

— А вось і я, — заявіў ён з парогу. — Ці не час вам паслухаць лекцыю пра міжнародную сітуацыю? Як вы ведаеце, наша краіна з'яўляецца ахвярай ціску заходніх дзяржаў і іх пятай кал…

Па ўсім было бачна, што брыгада была не ў вялікім захапленні ад прапановы госця.

— Слухай, Міхалыч. Давай у наступны раз. Нешта ў нас галовы баляць, — выказаў калектыўную думку ўсё той жа брыгадзір. Астатнія электрыкі дружна заківалі.

У Міхалыча ад здзіўлення аж дыханне перахапіла.

— Слухайце, — ачомаўся ён, — я чытаў вам даклад пра міжнароднае становішча апошні раз амаль месяц таму. Што здарылася? Раней вы больш ахвотна мяне слухалі.

Нечакана погляд госця трапіў на вокладку сшытка, які па дурасці адзін з будаўнікоў не паспеў схаваць. «Канспект па міжнароднай сітуацыі», — значылася на вокладцы. Міхалыч усё зразумеў.

— Дзе ён?

— Хто ён? — паспрабаваў зрабіць з сябе левага брыгадзір.

— Хто, хто — аватар у паліто. А вы не ведаеце?! Да мяне даходзілі чуткі, аднак я, дурань, не верыў. Сяргееў — адказны за ідэйную працу ў кранаўшчыкоў. Ён жа тут недзе хаваецца. А ну выходзь, казёл!

Сяргееву нічога не заставалася, як вылузаць з пыльнай шафы. Пры яго з'яўленні Міхалыч кінуўся на брыгадзіра з кулакамі.

— Ах ты, падступны здраднік. Як ты мог?

— Міхалыч, давай не рабіць сцэнаў. У жыцці ўсё бывае. Хіба я вінаваты, што ў снежні галоўны ідэолаг катэгарычна патрабавала, каб мы — адказныя за ідэалогію — ставіліся да калектываў як да родных. Я так і зрабіў. Аднак пасля таго, як пасварыўся з жонкай і збег з сям'і да каханкі, на аўтамаце ўжо таксама не мог ставіцца да кранаўшчыкоў як да родных. Як след, вырашыў знайсці ім замену — новы калектыў. Я ж не вінаваты, што нам добра разам.

Адзін з электрыкаў падтрымаў Сяргеева.

— Міхалыч, прабач. Нам сапраўды добра з Анатолем (так звалі Сяргеева). Ён так класна прымусова падпісвае нас на «Саўбелку».

Гэтыя словы быццам дабілі Міхалыча. Ён сеў за стол, адштурхнуў чыйсьці інструмент і зарыдаў.

— Ну добра. Годзе, Міхалыч, ты яшчэ малады, прывабны ідэолаг, — адзін з электрыкаў паспрабаваў яго суцешыць. — Мы можам заставацца сябрамі.

У гэты час стукнулі дзверы, і ў бытоўку ўварвалася бландзінка. Без усякіх там — «добры дзень», «прабачце» і іншых рытуалаў ,— яна атакавала Сяргеева.

— Пачвара! Скаціна! Ты ж казаў, што ты не можаш сёння застацца са мною, паколькі быццам ідзеш з сябрамі на піўняк — глядзець «Манчэстэр Юнайтэд». Гэта і ёсць твой Манчэстэр? — Жанчына (як усе здагадаліся, гэта і была каханка Сяргеева) кіўнула ў бок будаўнікоў. — Як ты мог? Як ты мог — здрадзіць мне з рабочым класам?!


«Ну добра. Годзе, Міхалыч, мы можам заставацца сябрамі». Малюнак аўтара

Будаўнікі пачырванелі.

— Дахаты можаш не прыходзіць, — кабета грукнула дзвярыма. Услед за ёй панура пасунуўся Міхалыч. На яго было цяжка глядзець.

— Не парся, Анатоль, — закурыў цыгарку брыгадзір. — Будзеш жыць тут, у бытоўцы. З намі.

— Тады, можа, працягнем лекцыю, — дакладчык палез за канспектам. Электрыкі пачалі радасна рассаджвацца.

— Такім чынам, як вы ведаеце, наша краіна з'яўляецца ахвярай ціску заходніх дзяржаў і іх пятай кал…

З. Ы.

На наступны дзень брыгада электрыкаў была знойдзена мёртвай — следства ўжывання атручанай гарэлкі. Побач ляжала запіска: «Дык не даставайся ты нікому». Па падазрэнню ў калектыўным забойстве міліцыя арыштавала Міхалыча.

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Аляксей Кароль

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 129
Падпісана да друку 12.02.2010. 8.00.
Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.